

ХОЧАШ
БЫЦЬ
ШЧАСЛІВЫМ?
БУДЗЬ!

ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ
ІНСУЛЬТ

11



Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЛІСТАПАДА 2023 г.
СЕРАДА
№ 212 (30092)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- Шэсць новых свідравін папоўнілі фонд «Беларуснафты» ў кастрычніку.
- Аўтаўладальнікам з 2024 года будуць выдаваць электронныя дазволы на ўдзел у дарожным руху.
- Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі за дзевяць месяцаў склаў каля $5 млрд.
- «Белавія» арганізуе прамы рэйс для грамадзян Беларусі, якія хочуць пакінуць Ізраіль.
- Зімовыя шыны з 1 снежня павінны быць устаноўлены на ўсіх колах аўто.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна ГУМЯНЮК, намеснік начальніка ўпраўлення бульбаводства, плодаагародніцтва, аграхіміі і аховы раслін Мінсельгасхарча:**

*«Сёлета ў міжсезонны перыяд патрэба ў агурках будзе забяспечана. Гэта стала магчымым за кошт зрушэння тэхналагічных тэрмінаў вырошчвання. У лістападзе мы плануем сабраць каля 1,5 тысячы тон агуркоў, што на 58 % больш, чым летась. Патрэба гандлю ў таматах у міжсезонны перыяд будзе задаволена айчыннымі на 35 працэнтаў. Вытворчасць таматаў будзе штогод нарошчвацца. Неабходных аб'ёмаў плануецца дасягнуць за кошт мадэрнізацыі існуючых вытворчасцяў».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Пытанне бяспекі атамнай станцыі — пытанне нумар адзін»

**У цэнтры ўвагі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — завяршэнне будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі і звязаныя з гэтым аспекты, у прыватнасці павышэнне даступнасці электраэнергіі для ацяплення дамоў. З адпаведным дакладам у кіраўніка дзяржавы выступіў міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч. Таксама былі запрошаны віцэ-прэм'ер Пётр Пархомчык і намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Ермаловіч.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт акрэсліў найбольш важныя пытанні. Першае — гатоўнасць атамнай станцыі і асабліва яе другога блока. Ён звярнуў увагу, што ўжо скончаны будаўнічыя і пусканаладачныя работы. Станцыя працуе на поўную магутнасць, праводзяцца прафілактычныя рэгламентныя работы. «Пытанне бяспекі нашай станцыі — пытанне нумар адзін, і тут няма чаго паўтараць і казаць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. У сувязі з гэтым, па яго словах, неабходна даводзіць да розуму нават нюансы.

«Расатам» павінен гэта выдатна разумець. Мы чарнобыльская рэспубліка, у нас нават найменшыя паблажкі пры будаўніцтве атамнай станцыі недазвальныя. Людзі нам ніколі не прабачаць. Адсюль такія жорсткія патрабаванні з нашага боку па розных нюансах, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Наколькі я інфармаваны, асноўныя вузлы, «ядзерны востраў» у парадку, функцыянуе, дзейнічае. А дэталі трэба дашліфоўваць і прыводзіць у адпаведнасць».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што тэрміны ўводу атамнай станцыі ў эксплуатацыю крыху зрушыліся па віне расійскага боку. Натуральна, было пастаўлена пытанне аб кампенсацыях. «Хаваць нічога не трэба. Зноў жа нічога надзвычайнага не было. Але, тым не менш, такія пытанні былі пастаўлены ў сувязі з тым, што былі парушаны тэрміны ўводу станцыі і адказнасць за гэта нясе расійскі бок. Яны нам прапанавалі варыянты і па кошце на свежае ядзернае паліва, як для расіян, як для сваёй краіны, і тэрмін гарантыйны на пяць гадоў (на асноўныя вузлы. — **«Зв.»**). Вы мне сёння раскажаце, ці задавальняе гэта беларускі бок. Мы, вядома, не павінны залішне напружваць расійскі бок, электрычнасці ў нас хапала і хапае. Але, тым не менш, дамова ёсць дамова. Ці дастатковыя тыя саступкі, якія зрабілі расіяне, «Расатам» для беларускага боку?» — спытаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

У згодзе з прыродай

# КАЛІ ВЫ ЎБАЧЫЛІ БУЙНЫХ ДРАПЕЖНІКАЎ...

**На шчасце, крытычнай праблемы паміж імі і чалавекам пакуль няма**



**У пытаннях захавання прыроды няма простых адказаў. Нашаму грамадству трэба вучыцца, як жыць з дзікімі жывёламі побач, як сябе з імі паводзіць і як да іх ставіцца. На жаль, але ў інфармацыйнай прасторы распаўсюджваецца шмат неаб'ектыўнай інфармацыі, фэйкаў і домыслаў, звязаных з дзікімі жывёлінамі. У першую чаргу апошнія могуць быць небяспечныя для чалавека як пераносчыкі шаленства, і ў гэтым плане дробныя куніцы і лісіцы — больш небяспечныя, чым буйныя мядзведзі, сустрэча з якімі для чалавека — вялікая рэдкасць. Такую думку выказаў на прэс-канферэнцыі намеснік генеральнага дырэктара НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Павел ГЕШТАЎТ.**

СТАР. 5

Будзьце пільнымі!

# ВІШЫНГ, ФІШЫНГ, НАРКАБІЗНЕС...

## У якія яшчэ злачынствы ўцягваюцца падлеткі?

**Сацыяльны партрэт непаўналетняга злачынца цяпер выглядае так: падлетак 15—16 гадоў, навучэнец установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, які, як правіла, у поле зроку міліцыі не трапляў. З забяспечанай поўнай сям'і. Пражывае ў буйным населеным пункце.**

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!
Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.
Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «Пытанне бяспекі атамнай станцыі — пытанне нумар адзін»


Фота БелТА.

## Трэба дапамагчы людзям

Другое пытанне — выкарыстанне электрычнасці для ацяплення. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў сувязі з уводам БелАЭС павялічваецца вытворчасць электраэнергіі ў краіне. «У нас і так электраэнергіі хапала і для прамысловасці, і для сельскай гаспадаркі, і для людзей у пэўнай ступені. Цяпер з'яўляюцца, не скажу лішкі — рэзервы з'яўляюцца, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Спажыванне электрычнасці будзе расці. Мы зрабілі пэўную стаўку на тое, каб падтрымаць нашых людзей».

Прэзідэнт згадаў, як наладжана ацяпленне ў дамах пасёлка Новай Аколіцы, што наведваў на мінулым тыдні: «Гэта цуд, я скажу. Чыста, акуратна. Нават не параўнаць з газавымі катламі ці абагравальнікамі. Я ўжо не кажу пра вугаль...»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што выкарыстанне электрычнасці для абагрэву дамоў — гэта выгадна, чыста і бяспечна. «Таму зрабілі стаўку правільна на тое, каб людзям прапанаваць электрычнасць і цэны прымальныя», — сказаў ён. Пры гэтым, як заўважыў беларускі лідар, 10-15 працэнтаў насельніцтва не маюць магчымасці атрымаць гэту паслугу. Па яго словах, работа над вырашэннем пытання праводзіцца. Але, пакольні попыт расце, таго, што зроблена, аказваецца недастаткова.

«Таму нам трэба павялічваць сеткі. Груба гаворачы, каб гэты провад ішоў да дома чалавека. Калі ўжо людзям паабяцалі, трэба. Людзі не дурныя, яны бачаць, адчуваюць, што гэта вельмі выгадная справа. Ды і электраэнергія ёсць. Навошта мы працуем? Для таго, каб дапамагчы людзям», — сказаў Прэзідэнт. Ён пацікавіўся, якія ёсць праблемы і якія бачацца перспектывы выкарыстання электраэнергіі для абагрэву дамоў. Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на электрычны транспарт. «Мы яго развіваем усё больш, гэта таксама правільна. Аказваецца, мы своечасова спахапіліся і сталі развіваць гэты кірунак», — заўважыў ён.

Яшчэ адно важнае пытанне — электраспажыванне. Яно набывае асаблівую актуальнасць, калі прыняць да ўвагі, што з'яўляюцца лішкі электраэнергіі. «Не пажадана, каб у нас Бярозаўская ці Лукомльская ГРЭС прастойвалі або ў халодным рэжыме мы іх эксплуатавалі. Трэба іх загружаць, варыянты ёсць і неблагія, і вельмі выгадныя для дзяржавы. У гэтым плане трэба працягваць работу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч далажыў: «Дзякуючы прынятым на ўзроўні кіраўніка дзяржавы і ўрада стымуляцыйным і арганізацыйным мерам за дзевяць месяцаў 2023 года аб'ём спажывання электраэнергіі ў краіне павялічыўся на 1,8 мільярда кілават-гадзін электрычнай энергіі і склаў 29,8 мільярда. І ўсё ў цэлым забяспечана за кошт уласнай вытворчасці электрычнай энергіі. Мае месца рост спажывання як рэальным сектарам эканомікі, у першую чаргу прамысловасцю, так і насельніцтвам. Таксама бачым і рост электраспажывання ў энергасістэме за кошт выкарыстання электракатлоў для цеплазабеспячэння буйных населеных пунктаў замест прыроднага газу», — сказаў міністр.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

У размове з журналістамі Віктар Каранкевіч расказаў, што праект узвядзення Беларускай атамнай электрастанцыі знаходзіцца на завяршальным этапе. Уведзены ў эксплуатацыю і ўжо адпрацавалі два рэгламентных цыклы першы энергаблок, з 6 кастрычніка гэтага года ён выведзены на другі планава-папераджальны рамонт. На другім энергаблоку 14 кастрычніка гэтага года былі поўнасцю завершаны ўсе рэгламентныя тэхнічныя мерапрыемствы па ўводзе яго ў эксплуатацыю. Блок на працягу 15 сутак адпрацаваў на намінальнай магутнасці, пацвердзіў свае характарыстыкі і праектныя паказчыкі і цяпер таксама знаходзіцца ў рабоце. Кіраўнік Мінэнерга прывеў лічбы: з моманту ўключэння першага энергаблока ў сетку станцыяй ужо згенеравана 20,6 мільярда кілават-гадзін электраэнергіі, што дазволіла разлікова замясціць 5,5 мільярда кубічных метраў прыроднага газу і знізіць выкіды парніковага газу ў атмасферу — разлікова больш за 9 мільёнаў тон.

«Цяпер урадам створана прыёмачная камісія на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Пятром Пархомчыкам. 24 кастрычніка ўжо атрымана ліцэнзія МНС на эксплуатацыю другога энергаблока. Вядзецца работа па атрыманні неабходных станоўчых заключэнняў наглядных органаў. У найбліжэйшы час рыхтуецца перадача ўсіх неабходных дакументаў для прыняцця адпаведнага рашэння прыёмачнай камісіі», — расказаў міністр.

Віктар Каранкевіч падкрэсліў, што будаўніцтва АЭС надало магутны імпульс развіццю іншых сумежных галін, пашырэнню прымянення электраэнергіі. У прыватнасці, гэта датычыцца электрамабіляў, электразараднай інфраструктуры. Міністр расказаў пра пілотны праект, у адпаведнасці з якім у Шклоўскім раёне і Жодзіне грамадскі транспарт будзе пераведзены з рухавікоў унутранага згарання на электробусы. Таксама Віктар Каранкевіч звярнуў увагу, што будаўніцтва АЭС істотна пашырыла магчымасці выкарыстання электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Пры гэтым з боку дзяржавы прыняты шэраг стымуляцыйных мер, у першую чаргу, гэта тарыфы і магчымасць кампенсацыі часткі расходаў грамадзян на набыццё электраацяпляльнага абсталявання або правядзенне ўнутрыдамавых работ для выкарыстання электраэнергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

«У выніку за 9 месяцаў 2023 года аб'ём спажывання электраэнергіі па краіне павялічыўся на 1,8 мільярда кілават-гадзін электраэнергіі і склаў 29,8 мільярда. Спажыванне электраэнергіі для мэт ацяплення і гарачага водазабеспячэння сярод насельніцтва склала больш за 400 млн кілават-гадзін, рост — у 1,3 раза да адпаведнага перыяду мінулага года», — сказаў міністр.

Таксама Віктар Каранкевіч расказаў, што Міністэрства энергетыкі плануе паскорыць тэмпы мадэрнізацыі размеркавальных сетак з мэтай стварэння найбольш камфортных умоў пражывання людзей (у першую чаргу ў вёсцы) і стварэння магчымасцяў выкарыстання электрычнай энергіі ў рэальным сектары эканомікі. Паводле яго слоў, у гэтым годзе аб'ёмы рэканструкцыі і будаўніцтва новых электрасетак ужо выраслі з 1,7 тысячы кіламетраў да 2,3 тысячы кіламетраў. Стаіць задача ў наступным годзе выйсці на тры тысячы кіламетраў. Таксама сёлета было рэканструявана высакавольтных ліній электраперадачы працягласцю 1,6 тысячы кіламетраў. «Электрычная энергія ад атамнай станцыі паступае ўжо ў любы рэгіён нашай краіны. Ёю могуць карыстацца і грамадзяне, і рэальны сектар у розных галінах. Гэта значыць, сеткавая інфраструктура, у прынцыпе, ужо дае магчымасць забяспечыць перадачу электраэнергіі», — падкрэсліў Віктар Каранкевіч. Цяпер акцэнт робіцца на мадэрнізацыі размеркавальнай электрасеткі. Гэта работа арганізавана на сістэмнай аснове не толькі для таго, каб задаволіць патрэбы насельніцтва, а з запасам, з улікам з'яўлення, новых вытворчасцяў, якія пашыраюцца ці будуць пабудаваны. На 2023 год прадугледжана мадэрнізацыя каля 5,6 тысячы кіламетраў электрасетак у больш як 1,5 тысячы населеных пунктаў.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Расія ўзначаліла рэйтынг наймацнейшых армій



Расія заняла першае месца ў спісе краін з самымі моцнымі ўзброенымі сіламі, паводле рэйтынгу амерыканскага часопіса US News&World Report, паведаміла ТАСС. Як адзначыла выданне, моц армій краін ацэньвалася на аснове меркаванняў рэспандэнтаў глабальнага апытання. Гэты крытэрый улічваўся пры складанні агульнага рэйтынгу найлепшых краін па версіі US News & World Report у падкатэгорыі «Сіла». Другое месца ў рэйтынгу краін з самымі магутнымі арміямі занялі ЗША, трэцяе — Кітай. Чацвёрты радок рэйтынгу заняў Ізраіль, на пятым — Паўднёвая Карэя. Рэйтынг быў складзены на аснове апытання 17 тысяч рэспандэнтаў з розных краін свету. Адзначаецца, што былі вызначаны 73 атрыбуты — тэрміны, што могуць быць выкарыстаны для апісання краіны і якія таксама маюць дачыненне да поспеху сучаснай дзяржавы.

### ААН: амаль 70 працэнтаў загінулых у Газе — жанчыны і дзеці



Генеральны камісар Блізкаўсходняга агенцтва ААН для дапамогі палесцінскім бежанцам і арганізацыі работ (БАПОР) Філіп Лазарыні заявіў, што амаль 70 працэнтаў загінулых у сектары Газа з пачатку абвастрэння канфлікту — жанчыны і дзеці. Пра гэта паведаміла ТАСС. З 7 кастрычніка загінулі больш за тры тысячы дзяцей. Паводле меркавання Лазарыні, гэта ніяк нельга назваць «спадарожнымі стратамі». Ён асабліва падкрэсліў, што пад абстрэлы трапляюць цэрквы, мячэці, бальніцы і аб'екты БАПОР, дзе спрабуюць выратавацца мірныя жыхары Газы. «Занадта шмат людзей былі забітыя ў пошуках бяспекі. Цяперашняя аблога Газы з'яўляецца калектыўным пакараннем», — адзначыў генеральны камісар БАПОР. Лазарыні заявіў, што мірныя жыхары Газы «адчуваюць, што з імі абыходзяцца не так, як з іншымі мірнымі грамадзянамі, што яны апынуліся ў пастцы гэтай вайны, да якой не маюць ніякага дачынення».

### Прэм'ер Казахстана назваў прычыну аварыі на шахце ў Карагандзінскай вобласці



Трагедыя са шматлікімі ахвярамі на шахце імя Кастэнкі ў Карагандзінскай вобласці Казахстана напрамую звязана з парушэннямі ў сферы прамысловай бяспекі, заявіў на пасяджэнні ўрада прэм'ер-міністр рэспублікі Аліхан Смаілаў, паведаміла РІА «Новости». Шахта імя Кастэнкі належыць АТ «АрселорМіталЦемcallтау». «У жніўні бягучага года на «АрселорМіталЦеміртау» ужо адбылася падобная аварыя. Тады загінулі пяць шахцёраў. Трагедыя з больш шматлікімі ахвярамі напрамую звязана з парушэннямі ў сферы прамысловай бяспекі. У гэтым віна, у першую чаргу, кіраўніцтва прадпрыемства. Іх поўнае самаўхіленне ад жыццядзейнасці кампаніі прыводзіць да трагічных наступстваў ужо на працягу некалькіх гадоў», — адзначыў Аліхан Смаілаў. Ён нагадаў, што на дадзены момант завяршаецца здзелка па перадачы «АрселорМіталЦеміртау» на карысць Казахстана. Як вядома, уначы 28 кастрычніка на шахце імя Кастэнкі ў Карагандзінскай вобласці адбылося ўзгаранне, у выніку выбухнула метана-паветраная сумесь. Загінулі 46 чалавек.

Сімвалы дзяржаўнасці

# ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ ВЕЛІЧНАГА БУДЫНКА

## Раман ГАЛОЎЧАНКА і Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА азнаёміліся з экспазіцыяй, прымеркаванай да 90-годдзя Дома ўрада

**Менавіта з гэтага велічнага адміністрацыйнага будынка, які з'яўляецца адным з сімвалаў нашай краіны, нярэдка пачынаецца знаёмства са сталіцай Беларусі. Захаваны ў першапачатковым выглядзе, Дом урада ўражвае не толькі сваім маштабам (240 тысяч метраў квадратных), але і цікавай гісторыяй. Адзін той факт, што стварэнне геніяльнага архітэктара Іосіфа Лангбарда выстаяла ў гады акупацыі, калі Мінск быў фактычна знішчаны, сведчыць аб многім.**



Фота БелТА.

Унікальныя звесткі з гісторыі Дома ўрада, дакументы, якія адлюстроўваюць працэс узвядзення гэтага манументальнага будынка, фотахроніку і артэфакты, што знаходзяць па сённяшні дзень, у фае Авальнай залы прадставілі першым наведвальнікам выставы «Дом урада: гісторыя і сучаснасць» — прэм'ер-міністру Раману Галоўчанку і Старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміру Андрэйчанку. Сімвалічна, што і Савет Міністраў, і ніжняя палата парламента размешчаны менавіта ў гэтых легендарных сценах.

«Дом урада мае вельмі багатую і няпростую гісторыю, — адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Гэта і Вялікая Айчынная вайна, і гады акупацыі і разрухі, і аднаўленне Мінска, і станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь — будынак прасякнуты гісторыяй і ўсе гэтыя гады працуе на карысць беларускай дзяржавы. Тут рыхтуюцца і прымаюцца законапраекты, пастановы ўрада. Тут у 1994 годзе прымаў прысягу Прэзідэнт Беларусі. Уся работа гэтага будынка накіравана на тое, каб нашы людзі жылі лепш, каб краіна развівалася, каб у ёй былі мір і парадак».

Спікер ніжняй палаты парламента заўважыў, што гісторыяй Дома ўрада заўсёды цікавяцца міжнародныя дэлегацыі, якія прыбываюць у Мінск. «Гэты будынак іх уражвае, таму мы заўсёды расказваем гісторыю Дома ўрада», — удакладніў ён.

### Ручная работа і ўдзячнасць будаўнікам

Адной з першых аб урачыстым адкрыцці Дома ўрада і помніка Уладзіміру Леніну, які знаходзіцца перад гістарычным будынкам, 5 лістапада 1933 года паведаміла газета «Звязда». Доўгачаканая падзея адбылася ў святочны дзень — 7 лістапада 1933 года.

Як сведчаць матэрыялы Нацыянальнага архіва, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў і Прэзідэнцкай бібліятэкі, гэтай падзеі папярэднічаў працяглы і напружаны перыяд будаўніцтва. Мала хто ведае, што з месцам, дзе павінны былі ўзводзіць Дом урада, вызначыліся не адразу. Прапаноўвалася чатыры лакацыі.

Конкурс на праектаванне Дома ўрада быў аб'яўлены 18 красавіка 1929 года: ён быў прымеркаваны да дзесяцігоддзя абвяшчэння Мінска сталіцай БССР. У конкурсе бралі ўдзел найбольш знакамітыя архітэктары таго часу. Перамог архітэктар Іосіф Лангбард. Менавіта ён прапанаваў унікальны праект, які потым сталі называць першым хмарачосам беларускай сталіцы.

У Дом урада меркавалася перасяліць 20 наркаматаў. Прадугледжваліся вялікая зала пасяджэнняў, памяшканні для харчавання і прыгатавання ежы, на цокальным паверсе планавалі размясціць амбулаторыю. Асноўная задача, якая стаяла перад будаўнікамі, — мінімізаваць перамяшчэнне па вуліцы кіраўнікоў усіх узроўняў.

Узводзілі легендарнае збудаванне ўручную — пад'ёмных кранаў у Мінску яшчэ не існавала. Не было і такога багатага спектра матэрыялаў, як цяпер. Дом урада будавалі з жалеза і цэглы. Калі не хапала прафесіяналаў, разбіралі іншыя пабудовы. На ўзвядзенне Дома ўрада пайшло дзевяць мільёнаў тагачасных рублёў.

Звыш 20 прафесіяналаў працавала над мастацкім аздабленнем будынка. Напрыклад, унікальныя барэльефы створаны народным мастаком БССР Андрэем Бембелем. Першапачаткова барэльефы вядомага скульптара, прысвечаныя гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы, адлюстроўвалі 300 фігур. Пры гэтым ні адна з іх не паўтаралася! Большасць фігур захавалася да нашых дзён.

У будаўніцтве Дома ўрада ўдзельнічала каля 10 тысяч чалавек (прычым як мужчын, так і жанчын) з усіх рэспублік Савецкага Саюза. Дысцыпліна на будоўлі была надзвычай строгая. Людзей, якія спазняліся або сыходзілі раней часу, чакалі канкрэтныя наступствы ў выглядзе пазбаўлення заробкаў і іншага.

Рабочых, якія прымалі ўдзел у будаўніцтве Дома ўрада, запрасілі на яго адкрыццё. Усе яны былі ўзнагароджаны спецыяльнымі прэміямі і наручнымі гадзіннікамі. Для іх была арганізавана ўрачыстая вячэра. Большасць кватэр, з якіх выехалі наркаматы, выдзелілі рабочым, якія будавалі Дом урада.

### Чатыры мільёны на аднаўленне

У гады Вялікай Айчыннай вайны Дом урада занялі немцы. Тут знаходзілася галоўнае ўпраўленне гестапа, размяшчаліся ваенныя штабы, пошта і нават казармы салдат. За перыяд акупацыі ў Дом урада трапіў толькі адзін снарад, у выніку чаго было пашкоджана яго правае крыло.

У дзень вызвалення беларускай сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 3 ліпеня 1944 года — пачалося размініраванне Дома ўрада. 1200 маладых мінёраў, а таксама 10 спецыяльна навучаных сабак, рызыкуючы сваім жыццём, ачышчалі будынак ад небяспечных знаходак. У выніку з гэтых сцен былі вынесены 184 авіябомбы і 14 скрынь з ручнымі гранатамі. У навядзенні парадку ў Доме ўрада бралі ўдзел і жыхары сталіцы. З дапамогай нашатырнага спірту змывалі свастыку, іншыя надпісы, прыбіралі ў памяшканнях, добраўпарадкоўвалі тэрыторыю. Гітлераўцы настолькі запусцілі будынак, што пасля размініравання і навядзення парадку быў аб'яўлены 32-дзённы каранцін. Усяго аднаўленчыя работы ў Доме ўрада вяліся на працягу трох гадоў. На гэтыя мэты пайшло каля чатырох мільёнаў рублёў — практычна палова ад сумы, патрачанай на яго будаўніцтва.

Пасляваенная гісторыя Дома ўрада таксама прадстаўлена ў экспазіцыі. Дакументы, фотаздымкі, прадметы побыту — усё гэта дазваляе дакрануцца да кожнай з эпох. Малавядомыя факты аб гісторыі стварэння і функцыянавання Дома ўрада ў розныя гады, а таксама аб жыцці архітэктара Іосіфа Лангбарда адлюстроўваюць кнігі і перыядычныя выданні, прадстаўленыя з фондаў Прэзідэнцкай бібліятэкі.

Даведацца ўнікальныя факты з гісторыі знакавага для краіны будынка ёсць магчымасць і ў юных беларусаў. Некаторыя з іх ужо азнаёміліся з экспазіцыяй.

**Вераніка КАНЮТА.**

Пастфактум

# ТРАЦІНА БЮДЖЭТУ — АД ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**Віцебшчына актыўна падключылася да Беларускага тыдня прадпрымальніцтва. Сёлета ў горадзе на Дзвіне ўпершыню прайшоў рэгіянальны ўніверсальны кірмаш дасягненняў прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу «Фарбы восені», які, як запэўнілі арганізатары, стане добрай традыцыяй паўночнага рэгіёна.**



З пачатку года ў Віцебскай вобласці адкрыта 300 новых прадпрыемстваў і 13 вытворчасцяў ва ўсіх галінах эканомікі, у іх створана больш за 1200 новых працоўных месцаў. У вытворчай сферы з'явіліся арганізацыі па распілоўцы і габлёўцы драўніны; вырабе сеткі з дроту, угнаенняў, прадуктаў з мяса і птушкі, сподняй бялізны, тэкстылю, спецадзення і іншых.

У рамках Дзяржаўнай праграмы «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва» на 2021—2025 гады ў 2023 годзе 20 суб'ектам малога бізнесу аказана дзяржаўная фінансавая падтрымка ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і ўдзеле ў выставачна-кірмашовых мерапрыемствах больш чым на 180 тысяч рублёў.

Як паведамілі ў камітэце эканомікі аблвыканкама, на тэрыторыі вобласці дзейнічаюць без малога 30 тысяч суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (МСП). У гэтым сектары занята каля 135 тысяч чалавек, або 29,3 працэнта ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы вобласці. За дзевяць месяцаў бягучага года паступленні ў бюджэт ад прадстаўнікоў МСП вырaслі да аналагічнага перыяду 2022 года на 17,3 працэнта і склалі 27,8 працэнта ў агульных паступленнях у кансалідаваны бюджэт вобласці.

У рамках Беларускага тыдня прадпрымальніцтва ў паўночным рэгіёне быў праведзены шэраг мерапрыемстваў для моладзі і ўжо вопытных прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу. Так, навучэнцы сярэдняй школы № 23 горада Оршы наведалі семінар «Маркетынгавая палітыка», у рамках якога Аршанскі рэгіянальны цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва і нерухомасці знаёміў 28 зацікаўленых дзевяцікласнікаў з комплекснай сістэмай арганізацыі, распрацоўкі, вытворчасці, прасоўвання і рэалізацыі тавараў і паслуг. Завяршылася мерапрыемства дзелавой гульнёй «Мой бізнес», падчас якой у сяброўскай дыялогавай прасторы школьнікі змаглі абмяняцца ідэямі і атрымалі ад спецыялістаў матывацыйны зарад да актывізацыі сваёй прадпрымальніцкай дзейнасці.

У Полацку на пляцоўцы цэнтра прыцягнення IGROW «Белаграпрамбанка» адбыўся круглы стол па тэме «Рэгіянальная прадпрымальніцкая экасістэма — аб'яднанне інтарэсаў праз інжынерную супольнасць», падчас якога абмяркоўвалася пытанне фарміравання Полацкай рэгіянальнай інжынернай супольнасці як добраахвотнага аб'яднання навукоўцаў, спецыялістаў і жыхароў рэгіёна, дзейнасць якіх звязана з вынаходніцтвам і практычным укараненнем распрацовак.

У пятніцу ў рамках Дня адкрытых дзвярэй азнаёміцца з дзейнасцю ўсіх ахвотных запрашалі інкубатар малога прадпрымальніцтва «Закон і парадак» і базавы цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва «Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу».

На Пушкінскай плошчы ў Віцебску працаваў першы рэгіянальны ўніверсальны кірмаш дасягненняў прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу «Фарбы восені», які на працягу трох дзён даваў гасцям і жыхарам горада тэматычныя пляцоўкі і радаваў гастрафэстам. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Віцебскі гарвыканкам, галоўнае ўпраўленне па адукацыі Віцебскага аблвыканкама і абласны цэнтр маркетынгу.

У першы дзень кірмашу моладзь знаёмілі са светам фінансаў, удзельнікі свята змаглі выпрабаваць свае веды ў віктарыне па фінансавай адукаванасці ад адной з банкаўскіх арганізацый. Каманды, якія ўдзельнічалі ў брэйн-рынгу «Эканамічныя веды — аснова паспяховага бізнесу», змагаліся за галоўны прыз — турыстычную паездку па Беларусі. Супрацоўнікі Дэпартамента аховы прадставілі паказальныя выступленні, шырока на кірмашы прэзентавалі праект «Чытаць. Любіць. Шанаваць», у рмках якога можна было набыць друкаваныя выданні, прысвечаныя гісторыі, культуры і традыцыям Прыдзвінскага краю. Яркім завяршэннем трохдзённага свята сталі выступленні найлепшых калектываў мастацкай самадзейнасці Віцебшчыны, караоке-батл і дыскатэка пад адкрытым небам.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота ТК Віцебскага аблвыканкама.**

# ВІШЫНГ, ФІШЫНГ, НАРКАБІЗНЕС...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле інфармацыі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, узровень падлеткавай злачыннасці ў краіне за 9 месяцаў бягучага года знізіўся на 9 працэнтаў. Але зніжэнне назіраецца не ва ўсіх рэгіёнах. У Мінску за студзень — верасень 2023 года зафіксаваны рост колькасці злачынстваў і правапарушэнняў, у тым ліку ўчыненых падлеткамі з сацыяльна пасяховых сем'яў. Тое ж датычыцца і Гомельскай вобласці: кожнае пятае здзяйсненае непаўналетнім злачынства рэгіструецца менавіта ў гэтым рэгіёне.

## Кароткая «кар'ера» закладчыка

— У структуры дзіцячай злачыннасці першае месца традыцыйна займаюць крадзяжы (гэта каля 40 працэнтаў ад усіх злачынстваў), далей ідуць хуліганства, махлярствы і незаконны абарот наркотыкаў. Часцей за ўсё гэтыя злачынствы здзяйсняюцца ў выхадныя дні, а трэць ад агульнай колькасці злачынстваў і правапарушэнняў — у начны час, — канстатуе **намеснік начальніка аддзела арганізацыі работы інспекцыі па справах непаўналетніх галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Рэспублікі Беларусь Васіль ДЗЕМІДОВІЧ.** — Прычына здзяйснення злачынстваў банальная: імкненне падлеткаў да атрымання лёгкіх і хуткіх грошай.

Апошнім часам усё большае распаўсюджванне ў маладзёжным асяроддзі атрымліваюць электронныя сістэмы курэння, такія як парагенератары і вэйпы. Яны і становяцца часцей за ўсё прадметам злачынных замахаў, прычым у ролі і патэнцыяльнай ахвяры, і злачынцы аказваюцца падлеткі. Не ўсе могуць дазволіць сабе купіць гэту даволі нятанную рэч. У выніку некаторыя ідуць на злачынства. Шукаюць у інтэрнэце патэнцыяльную ахвяру, якая хоча яе прадаць, дамаўляюцца аб сустрэчы ў людных месцах. Злачынца прыходзіць, як правіла, з сябрам, які адцягвае ўвагу прадаўца. На падставе агляду парагенератара яны з гэтай рэччу збягаюць, прысвойваючы сабе. Паколькі размова ідзе пра непаўналетніх, то злачынцы спадзяюцца, што ахвяра не паскардзіцца



ні бацькам, ні педагогам і не будзе звяртацца ў міліцыю. Пры гэтым многія падлеткі не задумваюцца, што за такі ўчынак можна пазбавіцца волі.

«Нягледзячы на зніжэнне колькасці злачынстваў у сферы незаконнага абароту наркотыкаў у 2,5 раза, кожны тыдзень затрымліваецца падлетак, у прыватнасці, за збыт наркотыкаў, а гэта даволі сур'ёзныя тэрміны зняволення. Непаўналетнім шляхам веернай рассылкі прапануюць падзарабіць, і яны згаджаюцца, — расказвае Васіль Дземідовіч. — Занятак не патрабуе вялікіх фізічных і часавых выдаткаў, да таго ж падлеткам даюць ілжывае пачуццё бяспекі».

Існуе меркаванне, што, працаўладкоўваючыся на работу ў інтэрнэт-краму па продажы наркотыкаў і рэалізоўваючы забароненыя рэчывы праз ананімныя платформы і месенджары, можна доўгі час заставацца па-за полем зроку праваахоўнікаў, пры гэтым зарабляць абяцаныя наймальнікам лёгкія казачныя грошы. Як правіла, рассыланне паведамленняў пра «працаўладкаванне» адбываецца праз сацыяльныя сеткі і месенджары. Наваспечаных «работнікаў» пераконваюць, што пры выкананні ўсіх мер бяспекі рызыка быць затрыманымі практычна адсутнічае. Жаданне хуткіх і лёгкіх грошай прымушае моладзь наіўна спадзявацца на ўдачу. Але ў рэальнасці сярэдні «працоўны стаж» маладога чалавека да моманту прыцягнення да крымінальнай адказнасці складае два-тры месяцы, а некаторыя пападаюцца і пры першай спробе зарабіць падобным чынам.

Узрост прыцягнення за незаконны збыт наркатычных сродкаў наступае з 14 гадоў, пакаранне — да 15 гадоў пазбаўлення волі (у выпадку смерці асобы, якой прададзены наркотык, — да 25 гадоў).

**Набірае папулярнасць сярод непаўналетніх яшчэ адна супрацьпраўная «прафесія» — «трафарэтчыкі».** Падлетку выдаюць трафарэт з назвай інтэрнэт-крамы, балончык фарбы і апраўляюць на вуліцы горада. Яны размяшчаюць «рэкламу» паслуг такіх наркамаркетаў шляхам нанясення надпісаў на фасады будынкаў, агароджаў, выкарыстоўваючы аэразольныя балончыкі. У залежнасці ад таго, на які будынак яна будзе нанесена, прадугледжана крымінальная або адміністрацыйная адказнасць. Склад злачынства прадугледжаны артыкулам 328 (незаконны абарот наркатычных сродкаў у складзе арганізаванай групы).

## Заробкі ў інтэрнэце

«Крадзяжы, махлярства, незаконны абарот наркатычных сродкаў — усё гэта характэрна для Мінска, — канстатуе **намеснік начальніка ўпраўлення па ахове правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Дзмітрый МЯЛЕШКА.** — Калі некалькі гадоў таму мы канстатавалі, што злачынствы здзяйсняюць пераважна дзеці з праблемных сем'яў, то цяпер, як гэта ні дзіўна, паводле нашай статыстыкі, у злачынную дзейнасць уцягнуты дзеці з пасяховых сем'яў. Мы лічым, што адна з прычын такой тэндэнцыі — недахоп увагі з боку бацькоў. Таксама да правапарушэнняў штурхае жаданне самасцвердзіцца, стаць незалежным у фінансавым плане ад бацькоў».

Падлеткі сышлі ў інтэрнэт, адпаведна і спосабы зарабіць яны шукаюць менавіта ў сеціве. **Адзін з адносна новых відаў злачынстваў — незаконнае распаўсюджванне рэквізітаў банкаўскіх картак за атрыманне ўзнагароджання.** «Ашуканцам няма розніцы, хто перад імі: дарослы або непаўналетні. Прапануючы ашуканскія схемы, яны ўцягваюць дзяцей у сваю злачынную дзейнасць, — папярэджвае Дзмітрый Мялешка. — У інтэрнэце можна знайсці аб'явы аб продажы рэквізітаў банкаўскіх картак. Непаўналетнія ў пошуках заробку афармляюць на сябе банкаўскія карткі ў любым з банкаў, а далей рэквізіты прадаюцца трэцяй асобе. Пакаранне за гэты від злачынства мае на ўвазе пазбаўленне волі да 10 гадоў».

Таксама распаўсюджаныя такія віды махлярства, як вішынг і фішынг. З дапамогай тэлефона пад любой падставай зламыснік выманьвае ў ахвяры рэквізіты банкаўскіх картак з наступным здыманнем грошай. Фішынг звязаны з незаконным доступам да асабістай інфармацыі (лагіна, пароля і інш.). З дапамогай падробленага інтэрнэт-рэсурсу здымаюцца грошы карыстальніка з прапановай яму перайсці па падробленых рэквізітах на старонку таго ці іншага плацежнага рэсурсу.

Яшчэ адзін від правапарушэнняў — сватынг, або лжывае паведамленне аб небяспецы, як правіла, пра замініраванне будынка. «Гэта зусім не свавольства і не гульня, — папярэджвае Дзмітрый Мялешка. — На паведамленні аб небяспецы службы рэагуюць аператыўна. За такое злачынства прадугледжана адказнасць да 5 гадоў пазбаўлення волі. Узрост прыцягнення да адказнасці — з 14 гадоў. Плюс бацькам давядзецца кампенсаваць урон, прычынены дзяржаве».

## Трымаць у полі зроку

Амаль кожнае сёмае ўчыненае падлеткамі правапарушэнне кваліфікуецца як хуліганства. Пра гэта расказаў журналістам **старшы пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі Генеральнай пракуратуры Раман СІДАРЭНКА.** З 926 правапарушэнняў, учыненых падлеткамі, 135 — гэта хуліганства. Дзеці праяўляюць п'яную ўдаласць, жадаючы даказаць сваю перавагу перад іншымі падлеткамі, а часам і дарослымі. Яны псуюць маёмасць, збіваюць людзей, але самае кашчунскае, калі падлеткі здзекуюцца з помнікаў і мемарыялаў вайсковай славы.

Раман Сідарэнка прывёў прыклад з практыкі, калі навучэнец ліцэя здзейсніў супрацьпраўнае дзеянне, а яго сябар зняў гэта на камеру з мэтай размяшчэння ў сацсетках. Падлеткі былі ўстаноўлены і рашэннем суда асуджаны за хуліганства. «Каб такія гісторыі не паўтараліся, педработнікам трэба ўзмацніць патрыятычнае выхаванне навучэнцаў, — канстатаваў прадстаўнік Генпракуратуры. — Вынік прафілактычнай работы адчувальны тады, калі ўсе суб'екты прафілактыкі — ад школы да бацькоўскай супольнасці — будуць займацца ёю ў комплексе».

— За кожнай сухой лічбай статыстыкі стаяць лёсы дзяцей. Каб такія негатыўныя з'явы былі максімальна нівеліраваны на заканадаўчым узроўні, створана і працуе сістэма прафілактыкі. Яна ўключае шэраг органаў і арганізацый, якія ўваходзяць у сістэму Міністэрства адукацыі, МУС, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, мясцовыя органы ўлады. Ёю замацаваны ролі і задачы кожнага суб'екта прафілактыкі, абавязкі. Сістэма дакладна працуе пры ўмове, што кожны дзяржорган выконвае ўскладзеныя на яго функцыі, а бацькі выконваюць свае задачы па выхаванні дзіцяці. На жаль, бацькі часта ігнаруюць трывожныя сігналы, якія паступаюць ад педагогаў, — адзначыў Раман Сідарэнка.

«За апошнія два гады фармат пракурорскага нагляду зведаў кардынальныя змены, што пацягнула змены ў падыходах да кожнага суб'екта прафілактыкі, — праінфармаваў прадстаўнік Генпракуратуры. — Так, больш увагі ўдзяляецца пытанням нагляду менавіта за тымі дзецьмі, якія раней не траплялі ў поле зроку праваахоўных органаў. Тыя падлеткі, якія стаяць на розных формах уліку, трапляюць пад прафілактыку, але з поля зроку выпадаюць дзеці, якія знаходзяцца ў спрыяльным асяроддзі. Выпусціўшы іх з увагі, часам як вынік мы атрымліваем учыненне імі правапарушэнняў і злачынстваў. Па выніках праверак за апошнія два гады было ўнесена больш за 5 тысяч актаў нагляду, і, прымаючы меры пракурорскага рэагавання, мы ў тым ліку карэкціруем работу суб'ектаў прафілактыкі. Гэта дае свой плён: за дзевяць месяцаў бягучага года ў краіне назіраецца зніжэнне амаль на дзевяць працэнтаў колькасці ўчыненых падлеткамі злачынстваў, у тым ліку цяжкіх і асабліва цяжкіх».

Як падкрэсліў спецыяліст, свет дынамічна мяняецца, мяняюцца і формы ўплыву на падлеткаў.

**«З'явіліся такія новыя пагрозы, як спорцікі. Моладзь выступае ў ролі супрацоўнікаў бяспекі наркамаркетаў, падтрымлівае ўнутрыгрупавую дысцыпліну, збівае наркакладчыкаў, якія правініліся, удзельнічае тым самым у распаўсюджванні псіхатропных і наркатычных рэчываў.** З'явілася і такая з'ява, як уцягванне падлеткаў у работу кур'ерамі тэлефонных злачынцаў, калі дарослыя людзі падманваюць састарэлых грамадзян. Іх аналіз сведчыць аб тым, што дзеці жадаюць мець сваю крыніцу даходу. Але хацелася б, каб гэтыя крыніцы былі законнымі», — канстатаваў Раман Сідарэнка.

Між іншым, летась пракуратура правяла маштабную праверку па пытаннях працоўнай занятасці непаўналетніх.

«Мы адзначылі, што попыт моладзі на працоўныя месцы вывучаўся недастаткова глыбока. Праца з патэнцыяльнымі работадаўцамі таксама праводзілася на нізкім узроўні. Некаторыя маглі, але не жадалі прымаць моладзь на часовую работу падчас канікул. Органамі пракуратуры праведзена праверка, інфармацыя патрапіла ў Савет Міністраў, і як вынік — на сёння мы можам адзначыць станоўчыя зрухі ў гэтым пытанні. Так, была прынята пастанова Мінпрацы, у якой пашыраны пералік лёгкіх відаў работ, дзе можа прымяняцца праца непаўналетніх», — адзначыў Раман Сідарэнка.

Спецыяліст праінфармаваў, што па ініцыятыве Генеральнай пракуратуры ў краіне будзе створаны цэнтр рэабілітацыі для нарказалежных падлеткаў. «Тэма наркаманіі не страчвае сваёй актуальнасці. На жаль, але ў нас няма цэнтра рэабілітацыі падлеткаў, якія сутыкнуліся з праблемай нарказалежнасці, куды б бацькі на канфідэнцыяльнай аснове маглі б змясціць сваё дзіця. Цяпер па ініцыятыве Генеральнай пракуратуры праводзіцца маштабная работа па стварэнні такога цэнтра. Ён будзе адкрыты на базе спецыяльных устаноў сістэмы адукацыі, — паведаміў Раман Сідарэнка. — Там нарказалежны падлетак зможа прайсці курс не толькі медыцынскага лячэння, але і сацыяльнай рэабілітацыі, што не менш важна».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Крымінал

## Дзве тысячы долараў «на гарбату»

**Мінчанін звярнуўся ў Фрунзенскае РУУС з заявай аб страце амаль 40 тысяч рублёў у эквіваленце, якія ён планаваў выдаткаваць на пакупку аўтамабіля.**

Мужчына растлумачыў, што апошні раз бачыў барсетку падчас сустрэчы са знаёмай у сталічным парку. Там ён заснуў на лаўцы, а калі прачнуўся, то не знайшоў ні жанчыны, ні грошай. Падрабязнасці здарэння паведаміла ГУУС Мінгарвыканкама.

Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі асобу мінчанкі, аднак яна аказалася недатычная да знікнення наяўных грошай. У ходзе далейшых аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўнікі высветлілі, што грошы выкраў 28-гадовы мінак: ён заўважыў у скверы мужчыну, які спаў, і забраў чужую барсетку.

Буйную суму ён патраціў на забаўкі, у тым ліку саўну, а таксама пакінуў дзве тысячы долараў таксісту ў якасці чаявых.

Вядома, што падазраваны нідзе не працуе, раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся. Распачата крымінальная справа за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Паграджаў забойствам маці

**У Пінскі ГАУС паступіла паведамленне, што ў кватэры адбылася сямейная сварка, падчас якой сын, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, выказваў пагрозы забойствам у адрас маці, пасля чаго нанёс не менш як чатыры ўдары каструляй у вобласць галавы 61-гадовай пенсіянеркі.**

На месца здарэння выбылі супрацоўнікі міліцыі, якія ўстанавілі, што сямейны канфлікт адбыўся ў выніку сваркі з-за таго, што сын прыйшоў у стане алкагольнага ап'янення дадому і не хоча афіцыйна працаўладкоўвацца на пастаяннае месца працы. Як паведамляе падраздзяленне па інфармацыі і грамадскіх сувязях Пінскага ГАУС, падчас сваркі сын пачаў паграджаць маці забойствам: узяў каструлю і нанёс не менш за чатыры ўдары ў вобласць галавы. Убачыўшы кроў, скандаліст уцёк з кватэры, а пацярпелая выклікала міліцыю.

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі падазраванага. 40-гадовы пінчанін нядаўна вярнуўся з лячэбна-працоўнага прафілакторыя, у якім знаходзіўся на прымусовым лячэнні.

Растлумачыць свае дзеянні зламыснік не змог, аб зробленым шкадуе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Навакольнае асяроддзе

# КАРЫСНЫЯ РУЧАЙКІ

## Адразу шэсць крыніц Гродзенскай пушчы прызнаны помнікамі прыроды

**Такі статус упершыню нададзены гідралагічным аб'ектам заказніка Гродзенскага раёна і замацаваны рашэннем Гродзенскага райвыканкама ў жніўні. А папярэднічала гэтаму працяглая праца навукоўцаў, эколагаў і актывістаў. Былі зроблены даследаванні, на падставе якіх крыніцы атрымалі пашпарты. Амаль усе яны маюць назвы, звязаныя з гістарычнымі падзеямі і з'явамі.**

### ТУТ ХАДЗІЛА ЭЛІЗА АЖЭШКА

Трэба сказаць, што назвы сапраўды цікавыя. Напрыклад, «Сто крыніц» сведчаць аб іх вялікай колькасці. А на месцы «Райгарад», згодна з паданнем, некалі быў горад, які праваліўся пад зямлю. Гэта самае нізкае месца ў Беларусі. Крыніца «Эліза Ажэшка» звязана з імем вядомай пісьменніцы, якая жыла ў Гродне і прыязджала сюды па ваду. Гэты факт увасобіла драўляная скульптура жанчыны з кніжкай у руках, якая сядзіць на лаўцы ў альтанцы. Кампазіцыя ўстаноўлена па праекце «Развіццё роднага краю» ў рамках абласнога конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў.

Пераможцам конкурсу стаў творчы калектыў «Крыніца». Яго кіраўнік Тэрэза Белавусава па працягу 30 гадоў папулярызуе прыродныя крыніцы Гродзенскай пушчы. Яна з дзяцінства добра іх ведае і дбае аб захаванні. Кажа, што яны гаючыя. У першую чаргу, звяртае ўвагу на чысціню вады, якая выходзіць наверх.

— Для надання крыніцам ахоўнага статусу праведзены даследаванні, якія вызначылі, якая гэта вада, — расказала Тэрэза Іосіфаўна. — Зроблена табліца мікраэлементаў, утрымання хімічных рэчываў, атрыманы аналіз біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці крынічных вод, іх гісторыка-культурнае значэнне. Вынікі даследаванняў увайшлі ў пакет дакументаў для разгляду камісіі райвыканкама. Сабраны матэрыял даў падставу для прыняцця рашэння аб аб'яўленні крыніц помнікамі прыроды мясцовага значэння.

Ахоўны статус набылі адразу шэсць гідралагічных аб'ектаў. Усе яны да гэтага былі ўключаны ў склад аб'ёмнага зборніка «Крыніцы Беларусі», які выйшаў з друку ў 2020 годзе з унікальнымі ілюстрацыямі.

### БОЛЬШ НЕ НІЧЫЙНЫЯ

Дарэчы, у Гродзенскім раёне нямала ахоўных тэрыторый. Як паведамілі ў Гродзенскай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і ахovы навакольнага асяроддзя, у раёне 17 помнікаў прыроды мясцовага значэння. Таксама тут зарэгістравана 42 біятопныя ландшафты на плошчы ў шэсць тысяч гектараў. У асноўным гэта лясныя масівы, верхавыя балоты, ельнікавыя і сасновыя ўчасткі. Ёсць у раёне два заказнікі рэспубліканскага значэння і тры — мясцовага. Усе яны маюць тую ці іншую каштоўнасць і знаходзяцца ў зоне аховы.

Цяпер за станам крыніц Элізы Ажэшкі, «Мар'яны», «Плебанішкі», «Райгарад», «Сто крыніц», «Каменка-2» будуць сачыць землекарыстальнікі — Гродзенскі лясгас, мясцовы сельгаскааператыў і сельскі Савет — згодна з прыродаахоўным заканадаўствам. Аб'екты маюць прававую абарону, свайго роду ахоўную грамату, дзе прапісана, што там можна рабіць, а што — нельга. Як падкрэслілі ў экалагічнай інспекцыі, самі ўласнікі свядома пайшлі на такі крок і разумеюць каштоўнасць прыроднага рэсурсу. У сваю чаргу, эколагі гатовы даць рэкамендацыі па абсталяванні водазабору, добраўпарадкаванні тэрыторый, стварэнні зон адпачынку. Дарэчы, большасць шыльд з назвамі ўстаноўлена ў рамках праекта грамадзянскіх ініцыятыў. Усе яны аформлены гродзенскімі скульптарамі і добра ўпісваюцца ў лясное асяроддзе.

### ЧАМУ ІХ ВАЖНА ЗАХАВАЦЬ

Вада, якая знаходзіцца блізка да паверхні зямлі і пад ціскам выходзіць наверх, ва ўсім свеце лічыцца недатыкальным багаццем. Такія запасы прэснай вады пільна ахоўваюцца. Па гэтаму шляху сёння актыўна ідуць і ў Беларусі, паведаміў **кандыдат біялагічных навук, супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН па біярэсурсах Юрый ГІГІНЯК.** Паступова да работы далучаюцца мясцовыя органы ўлады, святары. Яны асвячаюць крыніцы, праводзяць богаслужэнні, уладкоўваюць купелі і альтанкі. Аднак многія крыніцы аказваюцца пад пагрозай знікнення, асабліва з-за меліярацыі.

— Мы сутыкнуліся з такой сітуацыяй у Іўеўскім раёне, — прыгадаў Юрый Гігіняк. — У падобных выпадках прыходзіцца даказваць, што нават невялікі ключык, які б'е з зямлі, — гэта каштоўнасць і да яе трэба ставіцца беражліва. У гэтым сэнсе добрым прыкладам могуць стаць намаганні гродзенскай энтузіясткі Тэрэзы Белавусавай. Яна здолела аб'яднаць розныя інстанцыі і ведамствы, каб дабіцца ахоўнага статусу для крыніц, аб якіх даведалася ад сваіх продкаў.

У Беларусі каля сотні крыніц маюць такі статус. І гэта работа ідзе няспынна. Напрыклад, сёлета завяршаецца шасцігадовы праект па даследаванні найбольш значных крыніц у розных



рэгіёнах Беларусі. У першую чаргу звяртаецца ўвага на ручаі, якія могуць знікнуць. Навукоўцы сочаць за тым, каб вакол іх не вяліся забудовы, не ствараліся стыхійныя сметнікі. Землекарыстальнік абавязкова павінен пазначыць гідралагічны помнік прыроды адпаведнай шыльдай.

Вядзецца работа па пошуку яшчэ невядомых крыніц.

— Тут на дапамогу можа прыйсці насельніцтва. Мы былі б удзячны, каб інфармацыя аб існаванні крыніц паступала да нас, у Навукова-практычны цэнтр па біярэсурсах. Трэба, каб пра гэта ведалі і мясцовыя органы ўлады, і землекарыстальнікі. Крыніцы прэснай вады павінны быць пад аховай дзяржавы, — падкрэсліў Юрый Гігіняк.

У навуковай установе складзены рэестр крыніц. Але яшчэ даволі шмат ручайкоў, якія не даследаваны, а значыць, знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Між тым кожная крыніца — гэта яшчэ і пэўная гісторыя, бо мае сваё цікавае паданне. Як і гэтыя шэсць, што нядаўна набылі статус помнікаў прыроды. Тэрэзу Белавусаву засмучае той факт, што працэс падрыхтоўкі пакета дакументаў заняў не адно дзесяцігоддзе. Было б добра, каб важнасць гэтай справы зразумелі не толькі эколагі і грамадскія актывісты, але і дзяржаўныя служачыя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# КАЛІ ВЫ ЎБАЧЫЛІ БУЙНЫХ ДРАПЕЖНІКАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён канстатаваў, што буйныя драпежнікі заўсёды выклікаюць спрэчкі. Адны ўстаюць на іх абарону, іншыя выступаюць за рэгуляванне колькасці. Ёсць і радыкальная група, прадстаўнікі якой лічаць, што ў Беларусі ў прынцыпе не павінна быць папуляцыі драпежнікаў.

— Але ў гэтым пытанні патрабуецца ўзважаны падыход. Буйныя драпежнікі неабходныя для здаровага функцыянавання экасістэмы, для захавання біяразнастайнасці. Без ваўка, бурага мядзведзя, рысі нашы прыродныя ландшафты будуць непаўнавартасныя, — падкрэслівае Павел Гештаўт. — Паляўнічыя зацікаўленыя, у першую чаргу, у здабычы капытных, таму хочуць рэгуляваць колькасць драпежнікаў, з якімі ім даводзіцца канкураваць. Але драпежнікі існавалі ва ўсе часы, і гэта не прыводзіла да дэградацыі папуляцыі капытных...

Воўк, напрыклад, з'яўляецца паляўнічым відам. І, нягледзячы на пераслед чалавека, яго папуляцыя застаецца стабільнай. Выпадкі нападу ваўкоў на сельскагаспадарчых жывёл адзінкавыя, і яны вырашаюцца ў аператыўным парадку. Выпадкі нападу на чалавека ўнікальныя. Некалькі гадоў таму ў Стаўбцоўскім раёне воўк, хворы на шаленства, напаў на жанчыну і прычыніў ёй цяжкія цялесныя пашкоджанні. Выпадкаў нападу рысі на людзей, на сельскагаспадарчых жывёл не зафіксавана. Тым не менш на лакальным узроўні рысь можа аказваць уплыў на папуляцыю каштоўных паляўнічых відаў, што не спадабаецца аматарам палявання.

Што датычыцца бурага мядзведзя, то гэта жывёліна ўключана не толькі ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь — ахоўваецца ў шэрагу краін Еўропы. Разам з тым у Харватыі, Славеніі, Славакіі, Румыніі, нягледзячы на ахоўны статус гэтай жывёліны, дазволена паляванне на мядзведзя ў мэтах рэгулявання іх колькасці і ліквідавання праблемных асобін. Нават у Расіі, нягледзячы на тую акалічнасць, што мядзведзь з'яўляецца паляўнічым відам, колькасць канфліктных сітуацый з чалавекам дастаткова высокая, драпежнікі часам наносяць вялікую шкоду, у шэрагу рэгіёнаў мядзведзь таксама ўключаны ў Чырвоную кнігу, напрыклад, у Маскоўскай, Тульскай, Разанскай, Калужскай абласцях.



«Важна разумець, што мядзведзь актыўна рассяляецца, маладыя жывёліны займаюць сваю тэрыторыю, у час шлюбнага перыяду актыўна перасоўваюцца. У сярэднім за суткі мядзведзь можа пераадольваць адлегласці да 80 кіламетраў. Ён пераходзіць дарогі, адкрытыя ландшафты, яго могуць бачыць побач з населенымі пунктамі, — тлумачыць спецыяліст. — Жыхары могуць бачыць аднаго і таго ж мядзведзя, але ў страху вочы вялікія... У эпоху смартфонаў усе такія сустрэчы фіксуюцца і праз сацыяльныя сеткі імкліва распаўсюджваюцца. Насамрэч, жывёлін, якія пражываюць аседла, вельмі цяжка ўбачыць, яны вядуць схаваны лад жыцця, і ў лепшым выпадку можна сустрэць толькі прадукты іх жыццядзейнасці».

Сусветны вопыт сведчыць, што колькасць канфліктных сітуацый з мядзведзем залежыць, напрыклад, ад асаблівасцяў года і колькасці корму ў прыродным асяроддзі пражывання. Зазежнымі вучонымі праводзіліся даследаванні канфліктных сітуацый, якія адбыліся па ўсім свеце з мядзведзямі з 2000 да 2015 года. Было, у прыватнасці, устаноўлена, што няма розніцы ў колькасці нападаў мядзведзяў у краінах, дзе дазволена паляванне на іх, і краінах, дзе такое паляванне забаронена».

У асяроддзі паляўнічых раз-пораз гучаць прапановы аб выключэнні некаторых відаў жывёл з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь і адкрыцці на іх палявання.

— Мядзведзь уключаны ў спіс рэдкіх жывёл і жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — канстатуе **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Беларусі Пётр НІКАЛАЕНКА.** — Спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ацэньвалі колькасць папуляцыі мядзведзяў у нашай краіне на канец 2022 года ў 700 асобін. Пры гэтым у 2021 годзе налічвалася 580 асобін. 73 працэнты беларускай папуляцыі мядзведзяў сканцэнтравана ў Віцебскай вобласці, 23 працэнты — у Мінскай. На 60 працэнтах тэрыторый пражывання, дзе былі заўважаны бурыя драпежнікі, назіраліся самкі з медзведзянятамі, што сведчыць аб размнажэнні жывёл.

Рысь таксама ўнесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. На падставе аналізу ацэнкі колькасці рысі і прасторавага яе распаўсюджвання ў Беларусі вучонымі НАН устаноўлена, што на пачатку 2022 года ў Беларусі пражывала 900 асобін рысі. «Але фактычная колькасць рысі, якая склалася на тэрыторыі краіны, не гарантуе дэмаграфічную стабільнасць віду, — падкрэслівае Пётр Нікалаенка. — У 2021 годзе налічвалася 1007 асобін рысі, пры гэтым была адзначана адмоўная дынаміка ў Брэсцкай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях, якая характарызавалася адносна невялікай колькасцю гэтага віду. У 2022 годзе адзначаны станоўчы трэнд: на канец года колькасць рысі дасягнула 1134 асобін, гэта 75 працэнтаў ад экалагічнага патэнцыялу яе колькасці. Нават нягледзячы на павелічэнне папуляцыі, колькасць рысі ўсё роўна не дасягнула аптымальных значэнняў і яе выключэнне з Чырвонай кнігі — заўчаснае. Па ацэнках вучоных, для дасягнення экалагічнага патэнцыялу, а гэта 1520 асобін, патрабуецца яшчэ некалькі гадоў. Акадэміяй навук плануецца на аснове выкананых даследаванняў да 2025 года падрыхтаваць макет пятага выдання Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, пытанне аб змяненні статусу або захаванні дзеючага статусу па мядзведзю і рысі, магчыма будзе вырашана праз два гады... У 2024 годзе будзе праведзены ўлік колькасці гэтых драпежнікаў у адпаведнасці з нядаўнімі распрацоўкамі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Спадчына

# «ГАСПАДАР У ШУХАЎСКАЙ ВЕЖЫ НАРЭШЦЕ З'ЯВІЦЦА»

**Пасажыры цягнікоў, пад'язджаючы да станцыі Коханава, вядома ж, бачаць непадалёк незвычайную ажурную пабудову. А вось аўтамабілісты, якія праносяцца па трасе «Масква — Мінск», нават не здагадваюцца, што за шэсць кіламетраў ад дарогі, на чыгуначнай станцыі Коханава знаходзіцца воданапорная вежа канструкцыі сусветна вядомага інжынера і вучонага У. Р. Шухава.**

**Па ўспамінах мясцовага жыхара І. І. Ермакова, які ўдзельнічаў у яе будаўніцтве, Уладзімір Рыгоравіч (ён жа аўтар знакамітай вежы на Шабалаўцы ў Маскве) сам назіраў за ходам работ на станцыі Коханава і застаўся задаволены вынікам. І сапраўды гэта ўнікальная для Беларусі пабудова больш за 90 гадоў упрыгожвае і чыгуначную станцыю, і аграгарадок Звянячы.**






Паводле архіўных звестак, напрыканцы пазамінулага стагоддзя дарога ад Оршы да Коханава без прыпынкаў займала каля гадзіны. Дзякуючы працы як мінімум чатырох пакаленняў чыгуначнікаў, сёння гэтую адлегласць прыгарадны электрацягнік, падбіраючы і выпускаючы пасажыраў на шасці прыпынках, адольвае ўдвая хутчэй.

Інтэнсіўнасць руху цягнікоў, замена паравозаў на больш магутныя патрабавалі ўдасканалвання і сістэмы водазабеспячэння станцыі Коханава.

Чарговая рэканструкцыя, паводле адпаведнага тэхнічнага пашпарта (з расшырэннем помпавай станцыі, заменай абсталявання і будаўніцтвам новай воданапорнай вежы канструкцыі У. Р. Шухава) была зроблена ў 1932 годзе. Аднак век гэтага збудавання мог аказацца зусім кароткі. У ліпені 1941-га вадакачку, каб не служыла ворагам, хацелі ўзарваць савецкія войскі, потым спрабавалі гэта зрабіць партызаны, а нарэшце, ужо адступаючы, рыхтавалі падрыў гітлераўскія акупанты. На шчасце, чырвонаармейцы змаглі прадухіліць разбурэнне вежы.

Што дзіўна, у гады Вялікай Айчыннай яна не пацярпела і ад налётаў авіяцыі — працягвала працаваць, служыць людзям.

Неабходнасць у яе эксплуатацыі, па словах былога начальніка «Дарводаканала» Г. П. Вілкіна, які амаль усё жыццё адпрацаваў у сістэме водазабеспячэння Беларускай чыгункі, адпала пазней. У сувязі з пераходам грузавога і пасажырскага руху спачатку на цеплавозную, а потым на электравозную цягу, вада з вежы стала выкарыстоўвацца хіба зрэдку — для супрацьпажарных і тэхнічных патрэб...

Апошняя рэканструкцыя вежы, пасля якой застаўся толькі адзін рэзервуар аб'ёмам 300 кубічных метраў, была праведзена сіламі Аршанскага ўчастка водазабеспячэння амаль 25 гадоў таму. У 2019-м, адносна нядаўна, вежы прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. І прыкладна з гэтага ж часу вадакачка (у краіне такіх толькі дзве) з'яўляецца... безгаспадарнай. Падчас падрыхтоўкі матэрыялаў для фільма «Дзевяностагадовая спадчына Шухава на станцыі Коханава» я цягам шасці месяцаў накіроўваў лісты ў розныя інстанцыі з мэтай адшукаць фондатрымальніка (гаспадара) воданапорнай вежы. І ўдалося гэта зрабіць толькі пасля звароту асабіста да Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Н. І. Качанавай. Дзякуючы шаноўнай Наталлі Іванаўне, на пачатку 2024 г. у вежы нарэшце з'явіцца гаспадар і перад ім паўстануць пэўныя задачы. Па-першае, спатрэбіцца распрацоўка праекта рэканструкцыі аб'екта, па-другое, сама яго рэканструкцыя і далейшае турысцка-экскурсійнае выкарыстанне.

Аб фінансавай падтрымцы можна хадайнічаць перад Саюзнай дзяржавай. Наколькі ведаю (ёсць адпаведныя лісты), гэтую беларускую ініцыятыву гатовы падтрымаць Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі і Міжнародны Шухаўскі Фонд.

Калі кіраўніцтва Талачынскага райвыканкама палічыць магчымым ініцыяваць прысваенне статусу гісторыка-культурнай спадчыны і больш чым стагадоваму дому № 12 па вуліцы Вакзальнай, то ў перспектыве ў Коханаве можа з'явіцца цікавы турыстычна-экскурсійны комплекс.

Але ж для таго, каб ён стаў працаваць, прычым эфектыўна, зацікаўленым органам і арганізацыям трэба праявіць ініцыятыву, зрабіць захады для падрыхтоўкі кадраў і экскурсаводаў. Тады, атрымаўшы другое жыццё, воданапорная вежа інжынера У. Р. Шухава будзе прыцягваць турыстаў не толькі з Беларусі, але і далёка з-за межаў.

**Эдуард НАВАГОНСКІ, краязнаўца, кінааматар,**
*г. Орша.*

Весткі з месяцаў

# Успомнім мы, успомняць нас?

**Днямі ў абласной бібліятэцы імя Леніна прайшоў вечар памяці, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння журналіста, пісьменніка, шчырага патрыёта Айчыны Уладзіміра Хазанскага.**

Падчас вайны, у эвакуацыі, страціўшы бацьку, яму давялося кінуць вучобу ва ўніверсітэце, працаваць і грузчыкам, і мантажнікам... Аднак прафесію журналіста ён усё ж атрымаў і амаль 40 гадоў быў не толькі ўласным карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена» па Віцебскай вобласці і не толькі пісьменнікам. У розныя гады да чытачоў прыходзілі яго дакументальная аповесць «Юныя мсціўцы», «Віцебскія пачаткі», «Ася», «Спытайце ў бяроз...».

Плённым было і яго супрацоўніцтва з абласной тэлестудыяй, з таварыствам «Веды»: Уладзімір Якаўлевіч быў цудоўным выступоўцам, арганізатарам шахматных турніраў...

А таму не дзіўна, што на вечары памяці прысутнічалі ветэраны камсамола, актывісты БРСМ, дзеці герояў яго кніг, калегі, кіраўнікі грамадскіх арганізацый, моладзь.

**Віктар Гузневіч,**
*г. Віцебск.*




*Ёй верасень*
*спатканне прызначаў,*
*Дарыў кастрычнік*
*лісце залатое*
*І лістапад асенні*
*вальс спяваў —*
*Але ўсё гэта*
*адыйшло ў былое.*

*А сёння*
*час наступнага чакаць:*
*Убачыцца са снежнем-*
*дабрадзеем —*
*Ён шубу абяцаў*
*прэзентаваць...*
*Спатрэбіцца*
*ў зімовыя завеі!*

Падпіска-2023

# ГАСПАДЫНЯМ, ГАСПАДАРАМ «ЗВЯЗДА» Ў ДАПАМОГУ

## Што праўда, тое праўда: восенню і верабей багаты, а ўжо чытачы, падпісчыкі «Звязды»...

**Многія з іх маюць і з задавальненнем працуюць на сваёй «валочцы» зямлі, многія па рэцэптах нашай «Крынічкі» і «Хатняй энцыклапедыі» вырошчваюць багатыя ўраджаі, робяць так званыя закаткі на зіму. Гаспадыням, гаспадарам газета вырашыла дапамагчы і ў гэтым: днямі ў сценах рэдакцыі адбыўся чарговы розыгрыш прызоў.**

**Міксер SCARLETT SC-HM40S 16 Family Life выйгралі:**

**Бондар Юрый Анатольевіч,** г. Маларыта Брэсцкай вобласці;

**Лагойская Ганна Васільеўна,** в. Шапчына Талачынскага раёна Віцебскай вобласці;

**Лукомская Валянціна Аляксандраўна,** аг. Меркулавічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці;

**Барысевіч Сабіна Вітольдаўна,** м. Юрацішкі Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці;

**Гусева Таццяна Канстанцінаўна,** м. Зялёны Бор Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці;

**Лысеўская Ірына Леанідаўна,** г. Горкі Магілёўскай вобласці;

**Дзмітрыеў Аляксандр Барысавіч,** г. Мінск.

**Суперпрыз — кухоны камбайн Holt HT-FP-002 — выйграла**

**Мукасей Лізавета Іванаўна** г. Слонім Гродзенскай вобласці.

Віншуем шчаслівчыкаў!

Тым жа, каго ўдача абмінае (прынамсі, пакуль), зычым не засмучацца і не крыўдзіцца — не здраджваць роднай газеце на роднай мове: па-ранейшаму афармляць падпіску (на квартал альбо паўгоддзе), запоўняць адпаведныя купоны (у час падпісной кампаніі яны друкуюцца на пятніцах побач з праграмай тэлеперадач), адпраўляць на адрас «Звязды».

Тут, у рэдакцыі, іх зарэгіструюць, размяркуюць па абласцях ды горадзе Мінску, а ўрэшце па чарзе ссыплюць у чароўны саламяны капялюш і...

Шанц на выйграш мае кожны.

**АФІЦЫЙНА**

*Арганізатарам рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.*

*Рэкламная гульня «Смачная восень са «Звяздой» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 15.08.2023 г. (пасведчанне № 4348) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 верасня да 31 снежня 2023 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2023 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 64 падпісчыкі. Прызавы фонд разыграны цалкам.*

*Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў 8 (017) 271 81 53.*

Усмешачку

# Была б шыя...

**Некалі нашаму калгасу не шчасціла на старшынь. Вось і той быў не малады, не жанаты, а галоўнае — не спецыяліст, не гаспадар...**

Калгаснікі трохі пацярпелі яго ды напісалі скаргу ў райкам. Старшыню пасля гэтага выклікалі на бюро, прапясочылі, можа, нават вымову далі. Той не на жарт пакрыўдзіўся: прыехаў да сябе на кватэру (у адной бабулі пакой здымаў) і давай свае рэчы ў чамадан пакаваць. Гаспадыня яму:

— Саколік, а куды ж ты збіраешся?

Ён (*са злосцю*):

— Ды вось кіну ўсё і паеду! А сюды — хай іншага прызначаюць.

— А каго ж, дзіцятка?

— Ды не бойцеся: была б шыя, а хамут нейкі знойдзецца...

— Што — яшчэ горшы, чым ты?! — сарвалася ў жанчыны.




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

...Старшыня, як потым расказвала, дзе стаяў, там сеў! Мусіць, успомніў ці здагадаўся, што слова «хамут» — сінонім да слова «дурань».

**У. Корбан,**
*Мінскі раён.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

1 лістапада 2023 г. № 40 (726)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# РАЗМОВА АБ ВАЖНЫМ

**У дні, калі краіна жыла тэмай бацькоўскай любові і сямейных каштоўнасцяў — у сярэдзіне кастрычніка ў Беларусі адзначаюцца Дзень маці і Дзень бацькі, — у Полацку прайшлі надзвычай цікавыя і знакавыя мерапрыемствы. Іх праводзілі сумесна Савет Рэспублікі і Беларуская праваслаўная царква. Да ўдзелу ў круглым стале і «Размове аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», якія праходзілі ў знакавых месцах найстаражытнейшага горада краіны, былі запрошаны сем'і з усіх рэгіёнаў Беларусі. У адкрытым фармаце аб самым важным, аб традыцыйных каштоўнасцях і іх захаванні з удзельнікамі гаварылі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава і Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**







Фота БелТА.

Падчас круглага стала Наталля Качанава звярнула ўвагу на тэмы, з якімі звярталіся беларусы падчас тэматычнай «сямейнай» прамой тэлефоннай лініі 11 кастрычніка, што праводзілі члены Савета Рэспублікі: «Самая вялікая колькасць зваротаў была пра тое, каб прапісаць у Асноўным Законе нашай краіны шлюб менавіта паміж мужчынам і жанчынай. Нямала званкоў паступіла ад бацькоў, занепакоеных тым, што сёння бачаць дзеці ў інтэрнэце. Ледзь не паймена называлі блогераў, якія, па сутнасці, нясуць у масы, нашым дзецям дэструктыў. Нам трэба вучыцца адгароджваць дзяцей ад патоку хлусні, бруду, які льецца на нашу краіну з-за мяжы. Так, калі мы гаворым пра нашу гістарычную праўду, нашу слаўную гераічную гісторыю, гэта многім не падабаецца. Але мы павінны жыць па сваіх законах, сваім розумам, шанаваць свае традыцыі. Палітыка, якая ўстаноўлена ў нашай краіне, ставіць у цэнтр увагі чалавека. І гэта абсалютна правільна».

Мітрапаліт Веніямін закрануў тэму дэмаграфіі, падзенне ўзроўню нараджальнасці, уплыву інфармацыі, якая падаецца ў інтэрнэт-прасторы, і сказаў, што можна прапанаваць моладзі наўзамен дэструктыўных павеваў. Уладыка прапанаваў праз СМІ, культуру, адукацыю гаварыць пра традыцыйныя каштоўнасці, паказваць моладзі прыклад служэння як Радзіме, так і сваёй сям'і. У гэтым аспекце служыцелі царквы важным элементам лічаць захаванне спрадвечных традыцый і духоўна-маральных каштоўнасцяў нашага народа.



«Размова аб важным», што адбылася ў Сафійскім саборы, — сумесная ініцыятыва Савета Рэспублікі і Беларускай праваслаўнай царквы, якая была рэалізавана ўпершыню і прысвечана ўмацаванню статусу сям'і, папулярызацыі традыцыйных каштоўнасцяў як неад'емнай умовы захавання суверэнітэту, забеспячэння далейшага ўстойлівага развіцця і росквіту Рэспублікі Беларусь.

«Безумоўна, парламентарыям, выканаўчым органам, мясцовай уладзе, грамадскім арганізацыям, культурнай і рэкламнай індустрыі, сродкам масавай інфармацыі трэба будзе яшчэ многае зрабіць для захавання і прымнажэння традыцый вялікай і дружнай сям'і. Вельмі важна, каб дзяржаўная сямейная палітыка была не рэакцыяй на сітуацыю, якая складваецца, а аб'ектыўна ўлічвала бягучыя тэндэнцыі і прагнозы развіцця нашай краіны, Еўразійскага рэгіёна і свету, задавала трэнды і, несумненна, працавала на перспектыву», — падкрэсліла Наталля Качанава. Як адзначыла Старшыня верхняй палаты парламента, неабходна ў найбліжэйшы час актуалізаваць дзеючыя нарматыўныя прававыя дакументы ў сферы дзяржаўнай сямейнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. «Штогадовае правядзенне «Размовы аб важным» з пастаянным пашырэннем геаграфіі і адкрытым этнаканфесійным складам удзельнікаў з усіх рэгіёнаў краіны цалкам адказвае сфармуляванаму Прэзідэнтам нашай краіны лозунгу «Мы «Сем» Я» — шэсць абласцей і сталіца».

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін адзначыў, што за апошнія дзесяцігоддзі многія каштоўнасці, духоўныя прынцыпы былі страчаны, аднак не забыты. У іх адраджэнні можна абапірацца на вопыт старэйшага пакалення беларусаў, якія памятаюць традыцыі шматдзетных сем'яў. «Адраджаючы і аднаўляючы тое, што было страчана, мы павінны памятаць, што з'яўляецца асноватворнымі і найвышэйшымі функцыямі сям'і. Гэта адносіны, любоў, падтрымка адно аднаго, вернасць, выхаванне дзяцей, дасягненне высокамаральных ідэалаў — усё гэта застаецца», — падкрэсліў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

**Пасля сустрэчы ў Полацку сем'і, якія ўдзельнічалі ў мерапрыемствах, павезлі з сабой уражанні, цікавыя думкі і ідэі. Карэспандэнты «Мясцовага самакіравання» пазнаёміліся з некаторымі з іх бліжэй, распыталі пра паездку, ідэі, якімі дзяліліся падчас сустрэчы, пра надзённыя клопаты і самае важнае ў жыцці. Кожная шчаслівая сям'я шчаслівая па-свойму, пярэчачы класіку, можна сказаць пра нашых герояў. Зрэшты, вы самі ў гэтым пераканаецеся: усе гісторыі — у сённяшнім спецвыпуску, і ўсе яны — размова аб важным.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Ідэалогія, памяць, бяспека



### Тэмы гутарак членаў Савета Рэспублікі ў калектывах

● **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** прыняла ўдзел у пасяджэнні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, дзе былі разгледжаны шэраг актуальных пытанняў. Падчас абмеркавання стану спраў з кадравым забеспячэннем ідэалагічнай работы ў арганізацыях сталіцы спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што ад працы ідэолага залежыць вельмі многае. Па яе словах, калі чалавек займае кіруючую пасаду і ўмее працаваць з людзьмі, гэта выдатна. У якасці асноўнай задачы ідэолага Старшыня Савета Рэспублікі вызначыла ўменне даносіць праўдзівую інфармацыю аб тым, што адбываецца не толькі на прадпрыемстве або ў арганізацыі, але і ў краіне, у свеце ў цэлым. «Да людзей трэба ставіцца па-чалавечы, і галоўнае — справядліва, — дадала Наталля Качанава. — Што Прэзідэнт сказаў у звароце да народа і парламента? Сумленне, справядлівасць, дапамога, узаемападтрымка. Вось што мусіць быць у нас ключавым. І трэба ўважліва слухаць, што гаворыць Прэзідэнт, праводзіць гэту ідэалогію ў жыццё. За гэтым — мір у нашай краіне. Ад кожнага з нас залежыць, якой будзе наша краіна заўтра». Спікер звярнула ўвагу на ўменне прыцягнуць моладзь на прадпрыемствы. Па яе меркаванні, трэба часцей праводзіць сустрэчы са студэнтамі, школьнікамі, абменьвацца перадавым досведам.

● **Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ** прыняў удзел у пасяджэнні Уздзенскага раённага выканаўчага камітэта, падчас якога былі разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна за дзевяць месяцаў і ход выканання Дзяржаўнай праграмы «Увекавечанне памяці аб загінулых пры абароне Айчыны» на 2021—2025 гады. Сенатар пацікавіўся, як адаптуюцца суб'екты гаспадарання раёна да змен у сферы рэгулявання малога і сярэдняга бізнесу, у тым ліку ў галіне падаткаабкладання, як расцэньваюць новаўвядзенні прадпрымальнікі. Віцэ-спікер падкрэсліў высокую значнасць работы, якая праводзіцца Уздзенскім раённым камітэтам ГА «БРСМ» па стварэнні інтэрнэт-рэсурсу, які змяшчае інфармацыю аб памятных месцах, прысвечаных гістарычным падзеям Вялікай Айчыннай вайны, што адбыліся на тэрыторыі раёна, і аднаўленню даных аб знішчаных фашыстамі населеных пунктах. «Цяпер тэхналогіі дазваляюць ствараць так званую дапоўненую рэальнасць, і такія тэхналогіі трэба актыўна выкарыстоўваць, — лічыць Валерый Бельскі. — Гэта робіцца не толькі для ўвекавечання памяці. Гэта вельмі важна з пункту гледжання прыцягнення маладога пакалення, схільнага да новых тэхналогій, да гістарычных падзей, фарміравання патрыятызму і гатоўнасці абараняць сваю Айчыну ў выпадку неабходнасці».

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** ў рамках адзінага дня інфармавання сустрэўся з працоўным калектывам ААТ «Эксперыментальная база «Доўск» Рагачоўскага раёна, супрацоўнікамі шэрагу ўстаноў і жыхарамі вёскі Званец. Галоўнай тэмай адкрытай размовы стала сацыяльная бяспека, яе асноўныя прынцыпы і прыярытэты. Падчас дыялогу былі абмеркаваны розныя аспекты: падтрыманне сямейных каштоўнасцяў і захаванне моцнай сям'і як залогу стабільнасці беларускага грамадства, забеспячэнне эфектыўнай занятасці, умацаванне здароўя беларускага народа. Таксама былі разгледжаны тэмы харчовай бяспекі краіны, прадухілення траўматызму на вытворчасці і іншых надзвычайных сітуацый. Як звярнуў увагу член Прэзідыума Савета Рэспублікі, мы змаглі пры няпростай знешнепалітычнай сітуацыі захаваць сацыяльныя гарантыі, забяспечыць занятасць, рост узроўню жыцця насельніцтва, а самае галоўнае — стабільнасць у грамадстве.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Нават дома не пакідае клопат аб пацыентах»

## Сям'я Доўнараў з Гродна больш за 40 гадоў стаіць на варце здароўя

**Гэтай сямейнай пары ёсць чым ганарыцца. Усё сваё жыццё яны прысвяцілі адной з самых гуманных і запатрабаваных прафесій. Ігар Станіслававіч — дацэнт кафедры агульнай хірургіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Людміла Мікалаеўна — акушэр-гінеколаг гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Іх стаж вядзе адлік з першай паловы 80-х гадоў, і з тае пары яны не здрадзілі сваёй прафесіі, не шукалі лёгкага хлеба. Мабыць, гэта і ёсць патрыятызм, аб якім сёння вельмі шмат гавораць. Нашы героі лічаць, што варта проста добра рабіць сваю справу і жыць інтарэсамі краіны.**



Наша сустрэча адбылася познім вечарам, калі гаспадары толькі вярнуліся са сваіх медыцынскіх устаноў. За акном няспынна барабаніў дождж, а на стале стаяла гарбата з печывам. З-за кутка выйшаў важны чорна-белы кот. «Гэта наш Роксік, яго зусім малым падкінулі ў гараж, вада пасля мыцця была такая чорная, як сам», — заўважае Людміла Мікалаеўна, пакуль кот абыходзіць сваё жытло. «Утульна яму ў гэтым доме», — падумалася мімаходзь. І тое, што кату-падкідышу знайшлося месца ў такіх занятых людзей, выклікала ў душы не толькі павагу, але і ўдзячнасць.

Мяркую, што пачуццё ўдзячнасці суправаджае гэтых людзей усё жыццё. Бо як інакш?! Людміла Мікалаеўна як акушэр-гінеколаг знаходзіцца на самым першым этапе жыцця чалавека і нават значна раней. А яе намаганні падчас нараджэння дзіцяці наўрад ці могуць застацца па-за ўвагай.

Ігар Станіслававіч прыходзіць на дапамогу, калі чалавек апынуўся ў экстраннай сітуацыі, можна сказаць, на мяжы жыцця, дзе гаворка ідзе аб неадкладным хірургічным умяшанні. Бывалі выпадкі, калі з аперацыйнай хірург выходзіў літаральна знясілены і спустошаны.

З гэтай нагоды суразмоўца прыгадаў гісторыю са сваёй практыкі, якая асабліва запомнілася.

— Я толькі пачынаў працаваць урачом у Брэсцкай вобласці. Туды мяне з жонкай накіравалі пасля ВНУ. І вось аднойчы паступіў пацыент, якога трэба было тэрмінова аперыраваць. Іду па калідоры, а на канапе сядзіць мужчына, таксама пацыент бальніцы, не спалася яму. Праз некалькі гадзін выходжу з аперацыйнай, з мяне пот градам цячэ — аперацыя была складаная. А мужчына па-ранейшаму там сядзіць. Потым падышоў да мяне і кажа: «Я пяць гадоў працаваў лесарубам у тайзе, думаў, цяжэй працы няма. Але калі ўбачыў, у якім вы стане выйшлі з аперацыйнай, зразумеў, што праца хірурга значна цяжэйшая», — з гонарам за сваю работу расказаў Ігар Доўнар.

Сужэнцы разам больш за 40 гадоў. Яны працягваюць дынастыю медыкаў, якая пачалася з прадзядулі Ігара Станіслававіча яшчэ ў 1913-м. Земскі доктар не толькі лячыў месцічаў, але і ратаваў жыцці салдат падчас Вялікай Айчыннай вайны. У мірны час да яго прыязджалі лячыцца з усяго Савецкага Саюза.

Па шляху сваіх бацькоў пайшлі і двое сыноў Доўнараў — Руслан і Андрэй. Абодва выбралі хірургічную сферу дзейнасці. Сёння ў сямейным клане больш чым два дзясяткі дзеючых урачоў. Усе яны працуюць на карысць краіны, лечаць землякоў і ўсіх, хто звяртаецца па дапамогу.

Вось і падчас размовы Людміла Мікалаеўна аб нечым засяроджана задумалася. Аказалася, яе непакоіць будучая аперацыя. Кажа, што часта пракручвае такія сітуацыі перад тым, як прыступіць да іх ажыццяўлення...

Паездка ў Полацк стала для сужэнцаў Доўнараў прыемным сюрпрызам. Людміла прыгадала цёплую і вельмі пазнавальную экскурсію ў Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр.

— У сучасным жыцці вельмі складана спыніцца, зрабіць нейкія высновы, паразважаць, — кажа Людміла. — Там такая магчымасць ёсць, і гэта вельмі добра для тых, хто заблытаўся ў жыцці, каму патрэбна дапамога, духоўная падтрымка.

Ігар Станіслававіч зазначыў, што шмат праблемных пытанняў было ўзнята падчас круглага стала з удзелам Наталлі Качанавай і мітрапаліта Веніяміна. Прысутныя выказаліся на тэму дэмаграфічнай сітуацыі.

— Гаварылі аб тым, што маладыя пары не спяшаюцца заводзіць дзяцей. Прычым справа нават не ў фінансавых цяжкасцях. У многіх на першым месцы — кар'ера, уласны дабрабыт, вандроўкі. І толькі потым ідзе гаворка аб дзецях, прычым абмяжоўваюцца адным-двума. Хоць дзяржава даволі істотна падтрымлівае шматдзетныя сем'і як у фінансавых выплатах, так і ў плане жылля, — прыгадаў сутнасць выступленняў гродзенец.

Між тым колькасць родаў зніжаецца. Па словах Людмілы, якая шмат гадоў працуе ў радзільным аддзяленні, за дзесяць гадоў нараджальнасць тут знізілася амаль утрая. У сувязі з гэтым яна выказала меркаванне аб узроставым цэнзе на бясплатнае ЭКА. У Беларусі жанчына можа скарыстацца гэтым правам да 40 гадоў уключна. Доктар Доўнар лічыць, што ў гэтай справе не павінна быць абмежаванняў па ўзросце. Таксама яна агучыла праблему невыношвання цяжарнасці, што стала даволі распаўсюджанай з'явай у свеце. Удзельнікі сустрэчы пагадзіліся з тым, што вырашаць пытанне варта з ранняга выхавання дзяўчынак з прыцягнення іх да здаровага ладу жыцця.

— Падчас сустрэчы з Наталляй Качанавай і мітрапалітам Веніямінам быў зроблены важны акцэнт на правільным выхаванні будучых мам, каб яны не гналіся за недарэчнымі трэндамі ў адзенні, а больш адказна ставіліся да сябе, свайго здароўя, — зазначыла Людміла.

На думку Ігара, не варта пакідаць без увагі і ролю бацькі ў сям'і. Добрым зачынам можна лічыць новае свята — Дзень бацькі. Але варта ісці далей і, магчыма, зацвердзіць узнагароду татам, якія выхавалі дастойных дзяцей. «Можа, ордэн для бацькі ўстанавіць, наогул узняць прэстыж менавіта мужчынскага выхавання», — падаў тады рэпліку Ігар Станіслававіч. Дарэчы, такая прапанова была станоўча прынята ўдзельнікамі сустрэчы.

Уражанняў аб размове ў Полацку засталося шмат. Па словах маіх суразмоўнікаў, усе выступленні былі па сутнасці справы, ішла адкрытая гаворка аб праблемных пытаннях. У выніку дыялог расцягнуўся ажно на чатыры гадзіны замест дзвюх. Людмілу вельмі ўразілі адносіны да ўзнятых тэм спікера верхняй палаты парламента. «Здавалася б, з выгляду такая жалезная лэдзі, а на самай справе вельмі добры чалавек, ад яе сыходзіць любоў да людзей, да краіны. Чалавек гэтым жыве. Гэта сёння складана», — паразважала мая суразмоўніца. А сваё жыццёвае крэда нашы героі вызначылі так: «Калі дапамагаеш чалавеку пазбавіцца болю і палепшыць якасць жыцця, адчуваеш драйв і вялікае маральнае задавальненне».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з архіва сям'і ДОЎНАРАЎ.**

# «МАЯ СЯМ'Я — ЖЫВАТВОРНАЯ КРЫНІЦА»

**Сям'ю КУЛАКОВЫХ з Віцебска добра ведаюць не толькі ў паўночным рэгіёне, але і ў краіне. Пазітыўныя, творчыя і спартыўныя бацькі Марына Юр'еўна і Дзяніс Генадзевіч, якія дораць сваю любоў траім дачушкам, — актыўныя ўдзельнікі сямейных конкурсаў розных узроўняў. А сёлета ў гісторыі дасягненняў іх сям'і з'явіўся новы радок — удзел у рэспубліканскім сямейным форуме «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава».**



«Было прыемна атрымаць запрашэнне на рэспубліканскі сямейны форум, куды нас дэлегаваў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама. Дата яго правядзення супала з днём нараджэння нашай старэйшай дачкі Ксюшы, яе паўналеццем. Хваляваліся, як пакінем яе ў такое свята, але дачка супакоіла: «Смела едзьце, я віншаванні прыму пазней», — распавядае шматдзетная мама, начальнік фінансава-эканамічнага аддзела аднаго з філіялаў «Белдзяржстраха», старшыня пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Марына Кулакова. — У 2019-м мы сталі прызёрамі рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года», а ў 2021-м наша сям'я ўдзельнічала ў рэспубліканскім бацькоўскім форуме ў Нясвіжы, дзе мадэратарам выступіла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч. Мы вельмі ўзрадаваліся, сустрэўшы ў Полацку даўніх сяброў — сем'і, з якімі ўжо былі знаёмыя па конкурсе ў Мінску і форуме ў Нясвіжы. А пагутарыўшы, пераканаліся, што ў Беларусі жывуць сапраўды творчыя, таленавітыя, неардынарныя, працавітыя сем'і. Многія выхоўваюць пяцярых, шасцярых дзяцей, бяруць у свае сем'і малых з дзіцячых дамоў, дорачы ім бацькоўскі клопат і ўвагу. Гэта дарагога варта».

Галава сям'і Дзяніс Кулакоў распавёў, што на сустрэчы ў Полацку за кубкам гарбаты дзяліліся тым, як лепш выхоўваць дзяцей, сваімі назіраннямі аб тым, якімі яны растуць, якой бачаць будучыню. «Нашы старэйшыя дочкі — 18-гадовая Ксюша і 15-гадовая Кіра — марыць выйсці замуж адзін раз і на ўсё жыццё, бачачы прыклад бацькоў, і ў будучыні хочуць стаць мамамі траіх дзяцей, а малодшая дачка, 7-гадовая Аляксандра, дадае: «Чаму толькі траіх, можна і пяцярых!» — усміхаецца Дзяніс Генадзевіч.

Быць мамай і татам трох дзетак муж і жонка не планавалі. Аднак аказалася, што абодва працягваюць дынастыю шматдзетных бацькоў. І ў Марыны, і ў Дзяніса перад вачыма былі прыклады вялікіх сем'яў — па трое дзяцей у бацькоўскіх сем'ях, а ўжо пра дзядоў-прадзедаў і казаць няма чаго: тыя і на пяці дзетках не спыняліся.

Марына і Дзяніс разам вучыліся ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Пазнаёміліся на студэнцкай дыскатэцы. На трэцім курсе вырашылі згуляць вяселле. Дату рэгістрацыі прызначылі ў загсе: 6 ліпеня, а гэта пачатак Пятроўскага посту. «Мама падказала нам схадзіць у царкву, параіцца з нагоды дня заключэння шлюбу. Бацюшка адразу спытаў: «Калі плануеце вянчацца?» А мы меркавалі толькі грамадзянскую цырымонію, аб царкоўным таінстве нават не задумваліся і здзіўлена пераглянуліся. У сваю чаргу здзівіўся святар: «Вы, што, не думаеце вянчацца? Вы не плануеце доўгі і шчаслівы саюз на ўсё жыццё?» Калі мы выйшлі ад яго, сумневаў не засталося: абвянчаліся 30 чэрвеня. Гэты царкоўны абрад нібы пераварочвае свядомасць, і нават калі здараюцца нейкія сваркі, бязладзіца, прыходзіць на розум: мы ж вянчаліся, і ўсё становіцца на свае месцы. Калі б пры стварэнні сям'і хтосьці размаўляў з маладымі людзьмі пра веру, падказваў, накіроўваў, можа, і шлюбы сталі б мацнейшыя і абортаў — менш», — разважае Марына Юр'еўна.

Цяпер у вялікай і дружнай сям'і Кулаковых выхоўваюцца трое дачок. Старэйшая Ксюша абрала прафесію ўрача, у гэтым годзе паступіла ў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Сярэдняя Кіра пакуль вучыцца ў дзявятым класе і з прафесіяй яшчэ не вызначылася, але пераканана, што хоча таксама дапамагаць людзям. Малодшая Саша па прыкладзе старэйшай сястры марыць быць урачом. Кожная з дзяўчынак творчая, займаецца музыкай і танцамі. Усё ідзе ад бацькоў, якія на сваім прыкладзе прыцягваюць дзяцей да актыўнага і здаровага ладу жыцця, прывіваюць дочкам любоў і павагу да блізкіх.

Акрамя фізічнага, маральнага і творчага развіцця дзяцей, муж і жонка ўдзяляюць увагу і духоўным складальнікам асобы. Сям'я рэгулярна ходзіць у храм, які размешчаны непадалёк ад дома. У больш раннім узросце Ксюша і Кіра наведвалі нядзельную школу, удзельнічалі ў розных мерапрыемствах, прымеркаваных да царкоўных свят. Аднак і самі бацькі жадаюць ісці па сцежцы духоўнасці.

Распавядаючы пра любімыя сямейныя святы, галава сям'і прызнаўся, што больш за ўсё любіць... 8 Сакавіка! Дзяніс Кулакоў заўсёды імкнецца парадаваць усіх сваіх чацвярых дзяўчат. Увесь дзень сочыць за парадкам у доме, выконвае ўсе жаночыя абавязкі і, вядома, імкнецца здзівіць іх якім-небудзь вытанчаным ласункам.

Адзін з сакрэтаў доўгіх гадоў шчаслівага сумеснага жыцця Кулаковых заключаецца ў тым, што муж і жонка прывыклі ўсё рабіць разам: адпачываць, весяліцца, падарожнічаць, працаваць дома і на прысядзібным участку, займацца спортам, ладзіць святы. «Мая сям'я — гэта жыватворная крыніца, адкуль кожны з нас чэрпае натхненне і сілы», — так цёпла і шчыра характарызуе свой агеньчык шчасця Марына Юр'еўна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з архіва сям'і КУЛАКОВЫХ.**

# «Атрымалі благаславенне і рыхтуемся да таінства...»

## Пасля паездкі ў Полацк сужэнцы вырашылі павянчацца

**Трэнер-педагог павінен быць не толькі выдатным прафесіяналам, але і па-сапраўднаму светлым, добрым чалавекам, сем'янінам, патрыётам. У гэтым перакананыя Алена і Андрэй ВАЛЬМУС. Сёння гэтая пара — знакамітасць Баранавічаў. Сваім прыкладам яны паказваюць, як быць шчаслівымі бацькамі, аднымі з найлепшых у сваёй справе, як аддаваць сябе іншым людзям і хварэць за развіццё роднага горада.**

У Андрэя і Алены падрастаюць двое дзяцей: сыну Давіду — шэсць, дачцэ Марыі — два гадкі. Сям'я Вальмусаў расла і мацнела, а паралельна маладыя бацькі выбудоўвалі свой паспяховы сямейны праект. Муж і жонка — кіраўнікі танцавальна-спартыўнага клуба «Тытан» у Баранавічах. Сёння ён вядомы далёка за межамі Брэсцкага рэгіёна: у скарбонцы — перамогі на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. У клубе займаецца амаль 200 чалавек. Так што сям'я Вальмусаў, выходзіць, непамерна вялікая.

Сёлета іх клубу — пяць гадоў. Андрэй у ім адказвае за трэніроўкі па агульнафізічнай падрыхтоўцы. Выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры і спорту, ён вядзе таксама персанальныя трэніроўкі ў зале, карэкцыйныя, дзіцячы фітнес і не толькі. Алена — трэнер па спартыўна-бальных танцах. Яе «сусвет» — лацінаамерыканскі кірунак. Дарэчы, пасля заканчэння ўніверсітэта і ў Алены, і ў Андрэя былі прапановы застацца жыць і працаваць у Мінску, але для сябе гэты варыянт трэнеры нават не разглядалі. Хацелі расці як прафесіяналы ў родных Баранавічах. Сёння ў горадзе сям'я Вальмус вядомая мноствам цікавых валанцёрскіх праектаў.

— Ужо два гады на пастаяннай аснове вяду маладзёжны праект «Тата-зала». Збіраюцца бацькі са сваімі дзецьмі, якія хочуць праводзіць вольны час разам. Ёсць вялікая зацікаўленасць у гэтым праекце, аказвае дапамогу гаркам БРСМ, — адзначае Андрэй Вальмус.

Вядзе трэнер і валанцёрскі праект «Народная зарадка» — бясплатныя трэніроўкі для людзей любога ўзросту і любога ўзроўню фізічнай падрыхтоўкі.

— Сёлета ў летнія месяцы збіраліся ў парку. Але займацца можна ў любым месцы, было б жаданне. Цяпер, у халодную пару, будзем праводзіць гэты праект у фармаце залы, — дадае Андрэй.

Алена Вальмус — загружаная маладая маці і кіраўнік танцавальных гуртоў у клубе — сёлета пачала весці праект «Танцавальныя вечары». Гэта бясплатныя майстар-класы ў стылі «лаціна-шоу» ў гарадскім парку. Удзельнічаюць усе ахвотныя любога ўзросту і ўзроўню танцавальнай падрыхтоўкі. Гэты праект трэнеру дапамагае ўвасабляць у жыццё Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

— Апошні танцавальны вечар сабраў звыш 50 удзельнікаў. Нават не чакалі, што гэты праект стане такім папулярным. Бо і цяпер людзі тэлефануюць і цікавяцца, калі зноў будзе праходзіць танцавальны вечар, — распавялі Андрэй і Алена.

Пасля ўдзелу ў сустрэчы сем'яў са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталляй Качанавай і Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веніямінам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, сужэнцы Вальмус вярнулася дадому ўжо крыху іншымі.

— Мы пад такім моцным уражаннем, мы так пераналаштроіліся, мы вярнуліся такія акрыленыя, — дзяліліся Алена і Андрэй. — Паўплывала тое, што гэта быў наш першы досвед наведвання Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра: дзіўная магчымасць паглыбіцца ў атмасферу святога месца. Ад самой сустрэчы з Наталляй Іванаўнай і Уладыкам мы



шмат чакалі, але нават не думалі, што ўсё будзе настолькі душэўна, адкрыта. Не было ніводнага загадзя падрыхтаванага пытання, а сапраўды жывыя, вельмі цёплыя стасункі. Напрыклад, Наталля Іванаўна падзялілася, што падчас прыёму грамадзян паступаюць просьбы аб кантролі і блакіраванні кантэнту ў інтэрнэце, забароне сайтаў для падлеткаў. Мы з жонкай са свайго досведу работы з дзецьмі і моладдзю звярнулі ўвагу, што, калі нешта забараняеш, гэта часам спрацоўвае наадварот, выклікае цікавасць, толькі з пачуцця супярэчнасці. Цяпер вельмі важна ствараць альтэрнатыўны, канструктыўны, карысны кантэнт у інтэрнэце, не грэбаваць сучаснымі формамі падачы інфармацыі, — перакананы суразмоўцы.

Як распавялі маладыя бацькі, пасля сустрэчы ў іх была магчымасць сфатаграфавацца і паразмаўляць асабіста з ганаровымі гасцямі.

— Мы даўно задумваліся аб вянчанні, а гэтая сустрэча пераканала, што мы на правільным шляху. Атрымалі ад Уладыкі Веніяміна благаславенне і рыхтуемся да таінства, — падзяліліся Андрэй і Алена.

Як трэнеры, якія вельмі шмат працуюць з дзецьмі, іх сем'ямі і ў нейкай ступені задаюць стыль папулярных у іх горадзе мерапрыемстваў, сужэнцы імкнуцца ў сваіх праектах адлюстроўваць хрысціянскія каштоўнасці, папулярызаваць светлыя і добрыя адносіны паміж людзьмі.

— Мы праводзім шмат мерапрыемстваў і даўно хацелі адмяніць святы на тэму Хэлоўіна. Гэта нам не блізка. Так і зрабілі. Нас не ўсе зразумелі, але мы вельмі рады гэтаму рашэнню, — распавёў Андрэй. — Упэўнены, заўсёды трэба памятаць, што дзеці, падлеткі ўбіраюць жыццёвы вопыт дарослага, які з імі працуе. Педагог, трэнер павінен разумець, што на ім найвышэйшая адказнасць у плане фарміравання асобы будучага дарослага чалавека: трыста разоў трэба падумаць, ці сапраўды добрыя жыццёвыя каштоўнасці ты прывіваеш?

Сям'я Вальмусаў марыць, каб іх клуб у будучыні стаў агульнагарадскім культурным цэнтрам, дзе маглі б праходзіць мерапрыемствы для моладзі і не толькі, лекцыі, сустрэчы са спікерамі, якія могуць падзяліцца сваім жыццёвым досведам.

— Хочацца, каб былі мерапрыемствы, дзе дзяўчаты маглі б вучыцца праяўляць сваю цнатлівую жаноцкасць, прыгажосць, грацыю, а хлопцы на прыкладзе сапраўдных мужчын вучыліся, што такое мужнасць, гонар, сапраўдныя сямейныя каштоўнасці, — ужо не толькі мараць, але і ўвасабляюць у жыццё трэнеры.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва сям'і ВАЛЬМУСАЎ.**

# «ДВА МЯДОВЫЯ ДНІ...»

**Жыхарка Гомельскага раёна Надзея Нікіціна, артыстка Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек, — пераможца Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2019» у намінацыі «Мацярынская слава». Яе сям'я таксама лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года — 2019». Шматдзетная маці перакананая, што дзяцей у сям'і шмат не бывае, а добрыя таты вялікіх сямействаў заслугоўваюць ордэна Бацькі.**



У сям'і Нікіціных з аграгарадка Пакалюбічы Гомельскага раёна — шасцёра дзяцей. Бацька вялікага сямейства Мікалай Анатолевіч — супрацоўнік Дэпартамента аховы МУС Чыгуначнага аддзела Гомеля. Мама Надзея Васілеўна больш за дваццаць гадоў служыць у Гомельскім дзяржаўным тэатры лялек.

— Шматдзетнае мацярынства для мяне — гэта клопат, увага, удзел у кожным дні жыцця маіх дзяцей, але гэта яшчэ і сумяшчэнне ролі каханай жонкі, гаспадыні дома, творчага чалавека ў сваім калектыве, — расказвае Надзея Васілеўна.

Яна перакананая, што ёй вельмі пашанцавала, бо родны тэатр лялек — найлепшае месца, дзе можна гадаваць дзяцей. Менавіта праз лялечныя пастаноўкі дзіця ўпершыню ў жыцці знаёміцца з галоўнымі прынцыпамі — што такое дабро і зло, вучыцца суперажываць, выказваць свае эмоцыі. Усе дзеці Нікіціных выраслі ў тэатры.

Надзея і Мікалай выхоўваюць, як самі кажуць, тры дзяўчынкі-сястрычкі і трох хлопцаў-волатаў. У сям'і дзве пары двайнят і малодшыя сын і дачушка — пагодкі. Старэйшым Дзмітрыю і Дзяменцію ўжо па дваццаць. Яны студэнты. Дзяменцій вучыцца на чацвёртым курсе Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, а Дзмітрый сёлета закончвае Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, рыхтуецца стаць дыпламаваным трэнерам па спартыўнай гімнастыцы і акрабатыцы. Двайняты Аліса і Эльвіра шмат гадоў займаліся спартыўнай акрабатыкай. Дзяўчатам 17 гадоў, яны ўжо вызначыліся з будучай прафесіяй. Эля вучыцца на харэографа ў Гомельскім дзяржаўным каледжы мастацтваў імя Н. Ф. Сакалоўскага, Аліса абрала шлях педагога дашкольнай адукацыі, вучыцца ў Гомельскім дзяржаўным каледжы імя Л. С. Выгоцкага. Малодшыя дзеці — шасцігадовы Вова і сямігадовая Сафійка — вучні Пакалюбіцкай сярэдняй школы. Яны, як і старэйшыя браты і сёстры, займаюцца ў Гомельскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву № 4 па спартыўнай гімнастыцы і акрабатыцы.

— Дзеці ў нашай сям'і ўсе вельмі актыўныя, з дзяцінства і старэйшыя сыны, і дочкі займаліся спартыўнай гімнастыкай, акрабатыкай. Дзяменцій доўгія гады быў выхаванцам спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па водным пола. Мы ўпэўненыя, што менавіта магчымасць займацца спортам у самых сучасных спартыўных залах для дзяцей — неацэнная дапамога, якую дае наша дзяржава. Мы любім займацца плаваннем у вольны час. Калі наведваем палац водных відаў спорту, кожны раз адчуваем гонар за нашу краіну, за тое, якія ў нас спартыўныя цэнтры. Такая інфраструктура, лічу, — самая лепшая інвестыцыя ў здароўе дзяцей, далучэнне і бацькоў да здаровага ладу жыцця, да жыццёвай актыўнасці, — лічыць Надзея Васілеўна.

Надзея і Мікалай Нікіціны шчыра ўдзячны за магчымасць прадстаўляць Гомельшчыну на сустрэчы сем'яў са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталляй Качанавай і Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веніямінам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, у Полацку.

— На сустрэчы наша сям'я перадала падзяку кіраўніцтву краіны за тое, што на дзяржаўным узроўні адзначаецца Дзень бацькі. Мы прапанавалі разгледзець магчымасць заснавання ордэна Бацькі ў будучыні, — распавяла Надзея Васілеўна.

Нікіціных вельмі ўразіла сустрэча з Наталляй Качанавай і Мітрапалітам Веніямінам. Кажуць, спадабалася тое, што сем'і мелі магчымасць напрамую задаць любое хвалюючае пытанне. Запомніліся шматдзетным бацькам прапановы аб стварэнні мастацкіх фільмаў пра сем'і з дзецьмі, узнятыя праблемы дзяцей — сацыяльных сірот, словы падзякі ў адрас Прэзідэнта Беларусі ад сем'яў і медыкаў за магчымасць бясплатнага правядзення ЭКА.

— Вельмі прыемна, што можна данесці і сваю жыццёвую пазіцыю на падобных сустрэчах. Упэўнена, што калі дае Бог дзяцей, то гэта самая лепшая магчымасць падзяліцца сваім досведам, навучыць быць шчаслівымі і ўдзячнымі жыццю. Хаваць гэта ў сабе і не дзяліцца, лічу, — грэх. У сям'і дзяцей шмат не бывае, гэта дакладна. Яны цябе заўсёды трымаюць у тонусе, — дадала суразмоўца.

Нікіціны расказалі, як іх дзеці шчыра радаваліся пачастункам, якія прывезлі з сустрэчы ў Полацку бацькі.

— Дзеці нашы вельмі парадаваліся за нас, што нам выпаў гонар паўдзельнічаць у мерапрыемстве. Хочацца, дарэчы, падзякаваць за сам фармат сустрэчы бацькоў без дзяцей. Мы з мужам назвалі запрашэнне — два мядовыя дні. Не заўсёды ў шматдзетных бацькоў ёсць магчымасць кудысьці выехаць толькі ўдваіх. А яшчэ, дзякуючы таму, што нас запрасілі на сустрэчу, нашы дочкі змаглі папрактыкавацца ў вядзенні гаспадаркі. Справіліся выдатна. Дачка Аліса, якая будзе праходзіць практыку ў дзіцячым садку, змагла добра адчуць, што такое спраўляцца з малымі дома і дом дагледзець, бо трэба было не толькі накарміць, адправіць малодшых у школу і забраць, але яшчэ і падрыхтаваць да ўдзелу ў канцэрце. Маме з татам толькі фотасправаздачу даслалі, — папросту прызналася шматдзетная мама.

Ад імя мам Надзея Нікіціна папрасіла, каб падобных запрашэнняў і цікавых, запамінальных сустрэч было як мага болей. Кожны раз такія мерапрыемствы робяць яшчэ больш моцнымі і шчаслівымі сямейныя каманды.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва сям'і НІКІЦІНЫХ.**

# СЕМ'ЯМ НЕ ХАПАЕ... АРХІТЭКТАРА

## Сужэнцы з Магілёва выступілі на сямейным форуме ў Полацку з канкрэтнымі прапановамі

**Бацькі чатырох дзяцей (тры сыночкі і дачка) Аляксандр і Марына ЛАБАДЫРОВЫ, якія прадстаўлялі на рэспубліканскім форуме «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» Магілёўскую вобласць, прызнаюцца, што пад вялікім уражаннем ад двухдзённага мерапрыемства.**



— У першы дзень у нас была ўнікальная магчымасць пагутарыць са Старшынёй верхняй палаты беларускага парламента Наталляй Качанавай, — расказвае Аляксандр. — Чатыры з паловай гадзіны праляцелі як адна хвіліна. Нас было 28 чалавек, але кожнаму хацелася нешта сказаць. Наталля Іванаўна вельмі ўразіла ўсіх сваёй дасведчанасцю, сардэчнасцю, веданнем чалавечых праблем. Іх сапраўды вельмі шмат. А такія сустрэчы дапамагаюць знайсці выйсце са складанага становішча.

— Тут, у Полацку, у калысцы беларускай дзяржаўнасці, мы глыбей усвядомілі ролю сям'і ў дзяржаве, — кажуць сужэнцы Лабадыровы. — Дзеці — галоўнае. І чым іх больш, тым лепш. Кожны думае, што гэта яго асабістая справа, але мала хто разумее, што ў гэтым моц і будучыня ўсёй краіны.

Двухдзённы форум дазволіў удзельнікам шмат што пачуць з першых вуснаў. Пра ролю сям'і і тыя праблемы, якія пагражаюць, казалі прадстаўнікі розных міністэрстваў — адукацыі, сацыяльнай абароны, сілавых структур.

— Асабіста на мяне вельмі моцна паўплывала сама абстаноўка, у якой мы жылі два дні, — прызнаецца Аляксандр. — Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці, тут моцна адчуваецца дух хрысціянства. У нас была магчымасць наведаць Сафійскі сабор, Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр. І я пад вялікім уражаннем ад размовы з ігуменняй. Я заўсёды адчуваў, што нас па жыцці вядзе Бог, а тут рэальна зразумеў гэта, адкрыў яго для сябе. На форуме прысутнічала высокае духавенства на чале з мітрапалітам Веніямінам. Прадстаўнікі царквы казалі пра важнасць сямейных традыцый і іх захаванне, прыводзілі прыклады, што да рэвалюцыі наогул практычна не было разводаў. Людзі былі вернікамі і разумелі, што шлюб — гэта самая вялікая каштоўнасць для чалавека. Сямейныя пытанні вельмі інтымныя і складаныя. Гэта асобны свет, куды са сваімі правіламі не пойдзеш. Але часта маладой сям'і не хапае ведаў, каб уладкаваць сямейнае жыццё. У інтэрнэце заклікаюць жыць лёгка і не абцяжарвацца праблемамі, думаць пра сябе. Але гэта падман, які вядзе да разбурэння, і чалавека як асобы, і грамадства.

Аляксандр і Марына расказваюць, што іх вельмі ўразіў аповед сужэнцаў-медыкаў з Гродна, якія гаварылі аб праблемах з нараджальнасцю пасля абортаў і сямейных трагедыях на гэтай глебе, з-за якіх руйнуюцца чалавечыя лёсы.

— Мы з жонкай зрабілі высновы з пачутага, і я агучыў нашы прапановы Наталлі Іванаўне, — расказвае Аляксандр. — Дзяржава сёння робіць усё магчымае для падтрымкі інстытута сям'і і працуе над тым, як гэту дзейнасць яшчэ больш удасканаліць. Перакананы, што роля Беларускай праваслаўнай царквы ў пытанні папулярызацыі моцнай традыцыйнай сям'і, мацярынства і дзяцінства павінна стаць больш значнай і важкай у нашым грамадстве.

Калі сцісла сфармуляваць прапановы сям'і Лабадыровых, яны зводзяцца да наступнага. Па-першае, маладой сям'і трэба арганізаваць магчымасць прайсці дыспансерызацыю на прадмет вызначэння рэпрадуктыўнага ўзроўню і здароўя. Гэта, удакладняюць суразмоўнікі, трэба для стымулявання ў маладых пар і пар без дзяцей пачуцця мацярынства і бацькоўства. Але галоўнае ў тым, што на этапе дыспансерызацыі трэба падключыць духавенства. Каб яны змаглі «пасябраваць» з маладымі і быць для іх у будучым дарадчыкамі і духоўнікамі.

— У хрысціянстве акцэнт робіцца на стварэнне моцнай і здаровай сям'і ў духоўным плане, — кажуць сужэнцы. — Гэта гарманічная ўзаемаадносіны. Было б цудоўна арганізаваць у якім-небудзь раёне пілотны праект вось такога ўзаемадзеяння медыкаў і духавенства, а потым распаўсюдзіць на краіну.



Прапанова № 2 ад сям'і Лабадыровых — узмацніць адказнасць за сваіх выхаванцаў хросных бацькоў і зрабіць гэта таксама з дапамогай царквы.

— Улада не можа ўмешвацца ў такія тонкія паняцці, як разводы, здрады, сямейная нявернасць, — аргументуюць суразмоўнікі. — А вось царква якраз гэтым і займаецца. Яна тлумачыць маральныя законы, расказвае, як яны функцыянуюць. Праблема сіроцтва, калі дзеці становяцца адзінокімі пры жывых бацьках, вельмі актуальная. Дзяржавай робіцца ў гэтым кірунку шмат чаго. Але трэба гэта пытанне ўдасканаліць. Для вырашэння праблем у духу хрысціянска-сямейных каштоўнасцяў было б карысна, напрыклад, адрадзіць інстытут хросных бацькоў. Быў такі досвед, калі на хросных ускладаліся функцыі бацькоў. Для разумення, як гэта функцыянуе, таксама было б карысна правесці лакальны пілотны праект у раёне, дзе больш моцныя хрысціянска-сямейныя традыцыі. Напрыклад, у Полацкім.

Яшчэ адна ідэя ад сям'і Лабадыровых — увесці такое паняцце, як архітэктар сям'і.

— Пачынаючы са школы, а то і дзіцячага садка дзецям трэба тлумачыць, што сям'я — гэта найвышэйшая каштоўнасць, — кажуць Аляксандр і Марына. — У старшых класах, а далей у спецыяльных установах адукацыі і ВНУ павінен з'явіцца куратар, на якога будзе ўскладзена задача па папулярызацыі моцнай сям'і. Прычым традыцыйнай, як гэта і прапісана ў Канстытуцыі. Гэта тэма павінна быць на слыху і там, куды пойдзе працаваць малады чалавек. На прадпрыемствах, у працоўных калектывах прапагандай традыцыйных сямейных каштоўнасцяў павінен займацца спецыяліст з ліку кіраўніцтва. Добра, калі роля так званага архітэктара сям'і будзе ўскладзена на намесніка кіраўніка.

Бывае, што ў дзяўчыны або юнака наогул няма магчымасці стварыць сям'ю. Напрыклад, працуюць у выключна жаночым або мужчынскім калектыве, а часу дзесьці шукаць сабе другую палавіну няма. Жыццё ідзе, і цікавасць знікае.

Аляксандр жартуе, што яму, напрыклад, пашчасціла спачатку пазнаёміцца з цешчай.

— Па размеркаванні трапіў у сельскую школу настаўнікам, дзе мяне ацаніла дарослая калега. Расказала пра сваю дачку Марыну, але сустрэцца мы змаглі толькі праз тры гады. Яна вучылася ў Мінску і прыязджала дамоў на выхадныя. Я ж, наадварот, на выхадныя ехаў да сябе ў Магілёў. Але ж сустрэліся, пасябравалі і хутка зразумелі, што нашы ўяўленні пра сям'ю цалкам супалі. У 2011 годзе ў нас нарадзіўся першынец Ян, праз тры гады — Дан, яшчэ праз два — Радмір. А ў 2020-м нас парадавала сваім з'яўленнем Зарына. Нарадзілася якраз на Яблычны Спас.

Аляксандр і Марына выхоўваюць сваіх дзяцей на любові да працы.

— Гэта павінна быць асновай у выхаванні, — лічыць Аляксандр. — У нас ёсць дача, дзе мы вучым дзяцей, як сябе паводзіць у дарослым жыцці. Хлопчыкі павінны ўмець усё: капаць, будаваць... Я вучу дзяцей касіць траву звычайнай касой. Паказваю, як яе трэба кляпаць. Не ведаю, ці спатрэбіцца гэта ім у будучыні, але яны павінны гэта ўмець. Здаецца, дробязі, але з іх складаецца жыццё. І яны адыгрываюць вялікую ролю пры стварэнні сям'і. На форуме, дарэчы, я пераканаўся ў гэтым яшчэ больш.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва ЛАБАДЫРОВЫХ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**
**www.zviazda.by**
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 10.286. Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2023 года.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# АПЯРЭДЗІЦЬ УДАР

## Каму пагражае інсульт?

**Сёння кожны чацвёрты чалавек у свеце пераносіць інсульт. Яшчэ пяць гадоў таму гэта быў кожны шосты. Практычна мы назіраем эпідэмію інсультаў. Калі сумная тэндэнцыя захаваецца, то да 2050 года на планеце чакаецца 200 мільёнаў паралічаў штогод, прычым 102 мільёны пацыентаў будуць дэментнымі. Лічыцца, што гэта можа прывесці нават да падрыву сістэмы аховы здароўя некаторых краін свету.**

**Але ёсць добрыя навіны. Калі раней лічылася, што толькі 80 % інсультаў можна прадухіліць, то на сёння ў сувязі са з'яўленнем новых тэхналогій прафілактыкі можна прадухіліць ужо 90 % інсультаў. Пра іх, а таксама пра новыя тэхналогіі ў лячэнні гэтага захворвання расказалі спецыялісты.**

### У ТРОЙЦЫ ПРЫЧЫН

Інсульты і ў нашай краіне займаюць месца ў тройцы лідараў па прычынах інваліднасці і смяротнасці. У 2022 годзе было зафіксавана амаль 40 тысяч выпадкаў новых вострых інсультаў. Сёлета, паводле аператыўных даных, іх колькасць будзе крыху меншай.

— Гэта не можа не радаваць, бо насельніцтва нашай краіны ўсё ж такі прыслухоўваецца да рэкамендацый урачоў і імкнецца кантраляваць свае хранічныя захворванні, якія з'яўляюцца прычынай вострых парушэнняў мазгавога кровазвароту. А яны застаюцца ранейшымі: артэрыяльная гіпертэнзія, захворванні сэрца, якія прыводзяць да эмбаліі сэрца, атэрасклероз сасудаў галаўнога мозгу, цукровы дыябет, розныя шкодныя звычкі, якія спрыяюць развіццю парушэння мазгавога кровазвароту, — перамалічвае **загадчык аддзела неўралогіі і нейрахірургіі Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі, галоўны пазаштатны ангіянеўролаг Міністэрства аховы здароўя Сяргей МАРЧАНКА.**

У Беларусі выбудавана этапная сістэма аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з інсультам. Паводле слоў галоўнага ангіянеўролага, за апошнія два гады ёсць сур'ёзныя крокі ў дасягненні ўзроўню якасці лячэння, якое адпавядае вядучым краінам свету. Кожны год, пачынаючы з 2021-га, назіраецца практычна кратны прырост колькасці пацыентаў, якім прымяняюцца сучасныя метады лячэння — сістэмна трамбалітычная тэрапія або рэнтгенваскулярная тэрапія.

Перашкодай для больш шырокага прымянення гэтых метадаў па-ранейшаму з'яўляецца тое, што людзі несвоечасова звяртаюцца па медыцынскую дапамогу. У «залатыя» 4,5 гадзіны ад пачатку захворвання ў стацыянары дастаўляецца ўсяго каля 30 % пацыентаў з інсультамі. Аднак пры гэтым за апошнія гады ўдалося значна знізіць лятальнасць ад вострага парушэння мазгавога кровазвароту і кратна павялічыць лік пацыентаў, якія атрымліваюць або трамбалізіс, або тромбаэкстракцыю. За 9 месяцаў 2023 года ў Беларусі больш за 8 % пацыентаў з ішэмічным інсультам атрымалі такую тэрапію. У мінулым годзе іх было крыху больш за 4 %.

### ЁСЦЬ НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Як расказаў **загадчык лабараторыі неадкладнай і інтэрвенцыйнай кардыялогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Аляксандр БЕЙМЕНАЎ**, на сёння колькасць інсультаў прыблізна роўная колькасці вострых інфарктаў міякарда. У нашай краіне, пачынаючы з 2011 года, для лячэння інсультаў з'явілася магчымасць выкарыстоўваць рэнтгенэндаваскулярныя працэдуры. Яны з'яўляюцца максімальна эфектыўнымі пры лячэнні ішэмічнага інсульту, паколькі дазваляюць захаваць дзеяздольнасць пацыента. Эфектыўнасць гэтых методык у параўнанні з той жа трамбалітычнай тэрапіяй значна вышэйшая.

— Акрамя таго, гэтыя методыкі інтэрвенцыйныя, яны дазваляюць даставаць трамбы з сасудаў галаўнога мозгу і пашырыць тэрапеўтычнае акно, калі мы можам прымяніць якое-небудзь лячэнне. Калі я толькі пачынаў працаваць пасля заканчэння медыцынскага інстытута, пацыентаў з ішэмічным інсультам ніхто не перавозіў у клініку. Тры дні гэты чалавек знаходзіўся ў сябе дома, і толькі пасля гэтага пачыналася нейкае актыўнае лячэнне. У наш час падыходы рэзка памяняліся, мы імкнёмся ў максімальна кароткія тэрміны даставіць пацыента ў спецыялізаваны стацыянар, — параўноўвае Аляксандр Бейменаў.

Інсульты, або вострыя парушэнні мазгавога кровазвароту, дзеляцца на ішэмічныя і гемарагічныя. 85-88 % у цяперашні час складае ішэмічны інсульт, звязаны з закрыццём артэрыі тромбам. Гемарагічны інсульт, звязаны з кровазліццём, на шчасце, складае невялікую частку, але эфектыўна лячыць яго з дапамогай пэўных інтэрвенцыйных умяшанняў у шэрагу выпадкаў немагчыма. Асабліва — калі гемарагічнае кровазліццё адбылося непасрэдна ў саму структуру галаўнога мозгу, а не ў абалонку, якая яго атачае.

Па вялікім рахунку, гемарагічнымі інсультамі займаюцца нейрахірургі, ішэмічнымі — неўролагі, сардэчна-сасудзістыя і рэнтгенваскулярныя хірургі. Методыкі апошніх дазваляюць з эфектыўнасцю ад 30 да 60 % аднавіць дзеяздольнасць пацыента і прывесці яго да стану, калі чалавек можа сам сябе абслугоўваць і жыць самастойна.

Рэнтгенваскулярныя хірургі з дапамогай катэтарнай тэхнікі пранікаюць у сасуд і дастаюць тромб, які перашкаджае мазгавому кровазвароту. Методыка ў нашай краіне была ўпершыню выпрабавана яшчэ ў 2011 годзе — за чатыры гады да таго, як выйшлі афіцыйныя амерыканскія рэкамендацыі па яе выкарыстанні. Эфект такога лячэння ўражвае: пацыент з выяўленым неўралагічным дэфіцытам (які не можа размаўляць, рухаць рукой, нагой, мае плегію ці парэз) пасля выкарыстання такога метаду пачынае вяртацца да паўнавартаснага жыцця.

На жаль, рэнтгенэндаваскулярны метад лячэння можна выкарыстоўваць не ва ўсіх выпадках. Тут важным з'яўляецца ступень пашкоджання галаўнога мозгу. Яна вызначаецца пры дапамозе КТ ці МРТ, і на падставе гэтых даследаванняў прымаецца рашэнне аб той ці іншай стратэгіі лячэння.

Цяпер у краіне створана 10 міжраённых цэнтраў, якія разам з абласнымі аказваюць рэнтгенваскулярную дапамогу. Як адзначыў Аляксандр Бейменаў, маюцца некаторыя праблемы з падрыхтоўкай кадраў. Для іх вырашэння ствараюцца навучальныя курсы на базе Мінскага навукова-практычнага цэнтра трансплантaлогіі органаў і тканак.



### ЯКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ РЭАБІЛІТАЦЫЯ?

У пацыентаў пасля інсульту так ці інакш фарміруюцца пэўныя функцыянальныя дэфекты — неўралагічныя ў выглядзе рухальных ці маўленчых парушэнняў, глядзельных расстройстваў. Таму важным кампанентам дапамогі з'яўляецца рэабілітацыйная.

— У нашай краіне яна этапная і пачынаецца яшчэ ў вострым перыядзе — у аддзяленні рэанімацыі альбо ў інсультным аддзяленні, калі пацыент ужо не мае патрэбы ў рэанімацыйных мерапрыемствах, — расказвае **дацэнт кафедры медыцынскай рэабілітацыі інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Кацярына СВЯЦКАЯ.** — Мы пачынаем раннюю мабілізацыю такіх пацыентаў, уключаючы паэтапную вертыкалізацыю, навучанне элементарным навыкам самаабслугоўвання — памыцца, адзецца, пачысціць зубы.

Актыўныя рэабілітацыйныя мерапрыемствы пачынаюцца на наступным этапе. Гэта ранняя стацыянарная медыцынская рэабілітацыя, прычым наладжана яна як на рэспубліканскім узроўні, дзе выкарыстоўваюцца высокатэхналагічныя рэабілітацыйныя методыкі, так і на абласным. У кожным абласным горадзе працуюць цэнтры медыцынскай рэабілітацыі. На раённым узроўні арганізаваны або аддзяленні медыцынскай рэабілітацыі, або рэабілітацыйныя ложкі.

Наступны этап — амбулаторны, калі пацыенты ўжо ў стане наведваць паліклініку і атрымліваць рэабілітацыйныя маніпуляцыі. Для пацыентаў, якія не могуць наведаць паліклініку, наладжаны хатні этап рэабілітацыі, калі пэўныя фізіятэрапеўтычныя працэдуры выконваюцца дома.

### ХТО Ў ГРУПЕ РЫЗЫКІ?

У прафілактыцы ішэмічнага інсульту на першым месцы стаіць зніжэнне да кантрольных лічбаў ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці — так званага дрэннага халестэрыну. Адметна, што гэта дазваляе знізіць смяротнасць ад інсульту (а таксама ад інфаркту міякарда) на 20 працэнтаў.

— На сёння вылучаюць групы атэрасклератычных сардэчна-сасудзістых захворванняў высокай, вельмі высокай і экстрэмальна высокай рызыкі. Гэта пацыенты, у якіх ужо здарыліся пэўныя падзеі: інсульт, інфаркт міякарда, транзісторная ішэмічная атака, адначасова ў іх маюцца вельмі высокія лічбы ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці. Прычым частата інсультаў і іх цяжкасць напрамую залежаць ад канцэнтрацыі ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці ў крыві, — расказвае **дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Людміла АНАЦКАЯ.** — Але яна можа дастаткова добра рэгулявацца, і для гэтага існуюць фармакалагічныя прэпараты — статыны высокай інтэнсіўнасці ў высокіх дозах. Іх усяго два — аторвастацін і разувастацін.

Яны, як правіла, зніжаюць канцэнтрацыю ліпапратэінаў на 50 %. У пацыентаў з групы высокай рызыкі яна павінна 1,7-1,8 мілімоль на літр, а ў групе экстрэмальнай рызыкі — 1,4. Для яе дасягнення дадаецца прэпарат эзеціміб і іншыя.

— Наша фармакалагічная прамысловасць працуе так, што на сёння ёсць усе высокаэфектыўныя прэпараты дадзенай групы, прычым нават у выглядзе паліпілаў, што павялічвае прыхільнасць пацыентаў да лячэння, — адзначае Людміла Анацкая.

Яшчэ адна група рызыкі — пацыенты з фібрыляцыяй перадсэрдзяў, якая ў два разы павялічвае смяротнасць у пацыентаў з інсультам. Аднак яе таксама можна прадухіляць. Большасць пацыентаў атрымлівае прамыя аральныя антыкаагулянты, якія апошнім часам дазволілі значна знізіць смяротнасць ад інсульту і інфаркту міякарда.

Трэцяя група — пацыенты з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, якая, калі яе не кантраляваць, на 46 % павялічвае смяротнасць. Яшчэ больш цяжкая група — пацыенты з сардэчнай недастатковасцю, але з імі шчыльна працуюць кардыёлагі.

### ПРАФІЛАКТЫКА — ГЭТА...

Вырашальнае значэнне мае лад жыцця, асабліва ў тых пацыентаў, якія перанеслі інсульт. Часта яны ляжаць дома, не рухаюцца, што мае вялікае значэнне ў развіцці атлусцення і цукровага дыябету.

— Мы сутыкаемся на практыцы з тым, што нашы пацыенты, на жаль, не сочаць за ўзроўнем глюкозы ў крыві. Узровень глікаванага гемаглабіну павінен быць 5,4. Гэта мэтавы паказчык для таго, каб не здарыўся паўторны інсульт. Таму людзі пасля 50 гадоў і асабліва сталага веку хоць бы раз на год павінны праходзіць дыспансерны агляд для таго, каб ведаць свае мэтавыя паказчыкі глюкозы ў крыві, — раіць Людміла Анацкая.

Велізарнае значэнне мае харчаванне. Наш рацыён павінен утрымліваць як мінімум шэсць відаў садавіны-гародніны ў дзень. Варта ўжываць малочныя прадукты нізкай тлустасці, мяса і рыбу. Каларыйнасць павінна адпавядаць нармальнай вазе.

— У ранняй прафілактыцы мае значэнне прыём антытрамбатычных прэпаратаў. Акрамя антыкаагулянтаў гэта падвойная антыагрэгантная тэрапія, якая прымаецца кароткі перыяд, таму што можа выклікаць і страўнікавыя, і ўнутрымазгавыя крывацёкі. Потым пацыент пераходзіць на прыём аспірыну. Але хачу звярнуць увагу, што без прыёму гэтых прэпаратаў праз два гады верагоднасць інсульту павялічваецца амаль што ў тры разы. Першыя два гады яна складае ад 5 да 19 %, потым ад 22 да 50 %. Таму няправільна, калі многія расслабляюцца і лічаць, што таблеткі можна і не прымаць. Антытрамбатычная, гіпаліпідэмічная тэрапія, кантроль цукру і рытму працяглы час — вельмі важныя аспекты прафілактыкі, — рэзюмуе Людміла Анацкая.

Адметна, што ў прыхільнасці пацыента да лячэння павінны прымаць удзел яго блізкія. Яны мусяць добра ведаць усе фактары рызыкі інсульту, якія маюцца ў пацыента і дапамагаць яму іх кантраляваць. Абавязкова ў такіх пацыентаў павінны быць таблетніцы, каб чалавек сам загадзя раскладваў на тыдзень неабходныя прэпараты. Кантраляваць іх прыём можна і праз гаджэты, ставячы нагадванне на смартфон.

## Извещение
## о проведении повторного аукциона по продаже в частную собственность гражданам земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор аукциона – **Ивенецкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

| № п/п | Адрес, кадастровый номер участка | Площадь земельного участка, га | Характеристика инженерных коммуникаций | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток 20 % (бел. руб.) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| 1 | д. Голобурды, 42А, кадастровый номер 622084303701000055 | 0,2500 | Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП | 6500,00 | 1300,00 | 2081,64 + расходы на размещение информации в СМИ |
| 2 | д. Ткачи, кадастровый номер 622084322101000019 | 0,2500 | Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП | 5375,00 | 1075,00 | 1721,65 + расходы на размещение информации в СМИ |

Аукцион состоится **06.12.2023** года (среда) в 10.00 по адресу: г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **01.12.2023** года (включительно) до 17.00 по адресу: г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, кабинет управляющего делами исполкома. Время работы: понедельник–пятница с 8.00 до 17.00 с обеденным перерывом с 13.00 до 14.00. Вся информация размещена на сайте Воложинского райисполкома: www.volozin.gov.by.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 20 % от начальной цены участка перечисляется на расчетный счет госказначейства счет № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Для участия в аукционе организатору аукциона в срок, установленный в информационном сообщении о проведении аукциона, физические лица либо их представители представляют:

**заявление** на участие в аукционе по утверждаемой форме (представителями граждан – нотариально удостоверенная доверенность);

**квитанцию** об оплате задатка (оригинал).

При подаче заявления на участие в аукционе физические лица (представители физических лиц) предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его **копию!!!**

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня утверждения протокола

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «АвтоЮла» (продавец) в лице антикризисного управляющего Потапченко Д. А. извещает о проведении 04 декабря 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Полуприцеп бортовой SCHWARZ MUELLER SPA 3/E.,** цвет – черный, кузов VAVJ203398H276760, рег. № 6783АА-3, 2008 года выпуска | **22 000,00** | 1 100,00 | **1 100,00** |

**Продавец:** ООО «АвтоЮла», 246021, г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 773-34-28,** Потапченко Дмитрий Анатольевич – (правовая информация, предварительная запись на осмотр имущества). **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 01 ноября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 30 ноября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить все затраты, связанные с организацией и проведением торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **7 (семи) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (044) 599-18-16, 8 (0232) 23-23-56.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## Извещение о публичных электронных торгах (аукционе)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Вторые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 04.10.2023 в г. «Звязда» № 192 (30072), стр. 12**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1** | Вальцы 800 «Рифайнер», инв. № 4050, бывшие в эксплуатации | 14 496,00 | 7 248,00 |
| **2** | Вальцы 800 «Рифайнер», инв. № 4051,бывшие в эксплуатации | 10 944,00 | 5 472,00 |
| **3** | Вальцы 800 «Рифайнер», инв. № 4055, бывшие в эксплуатации | 9 120,00 | 4 560,00 |
| **4** | Вальцы 800 «Рифайнер» № 1, инв. № 10111232, бывшие в эксплуатации | 14 496,00 | 7 248,00 |
| **5** | Вальцы 800 «Рифайнер» № 2, инв. № 10111232, бывшие в эксплуатации | 9 120,00 | 4 560,00 |
| **6** | Вулканизатор «Берeдорф», барабанный, бывший в эксплуатации, инв. № 5239 | 13 536,00 | 6 768,00 |
| **7** | Вулканизатор «Берeдорф», барабанный, бывший в эксплуатации, инв. № 5240 | 19 104,00 | 9 552,00 |

**Седьмые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 06.10.2023 в г. «Звязда» № 194 (30074), стр. 14**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **8** | Хозяйственно-складской участок № 76, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102 | 14 688,00 | 9 792,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by**

**По лотам №№ 1–7:** победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона).

**По лоту № 8**: победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 15.11.2023 начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 14.11.2023 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-74019 (наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 247,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 75/ 1, на земельном участке с кадастровым номером 121281200001000016 площадью 0,2504 га | 45 500,00 | 4 550,00 |
| **Лот № 2:** капитальное строение с инвентарным номером 100/U-95362 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, д. Ковердяки, ул. 50 лет Победы, 9, на земельном участке с кадастровым номером 121283004101000309 площадью 0,4279 га | 20 000,00 | 2 000,00 |
| **Лот № 3:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-96314 (наименование: зерносклад; назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения) площадью 317,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 38А/5, зерносклад, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000091 площадью 0,1075 га | 44 700,00 | 4 470,00 |
| **Лот № 4:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-73759 (наименование: телятник фермы № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 517,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 74, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001002961 площадью 0,6678 га, составные части и принадлежности: навес | 80 000,00 | 8 000,00 |
| **Лот № 5:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-74045 (наименование: зернохранилище; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 1111,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 66/ 2, на земельном участке с кадастровым номером 121281200001000021 площадью 0,3055 га | 144 000,00 | 14 400,00 |
| **Лот № 6:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71136 (наименование: телятник; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1441,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 39В, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000117 площадью 0,5552 га, составные части и принадлежности: уборная, выгульный дворик, рампа погрузо-разгр., пожарный резервуар, площадка для мусора | 176 000,00 | 17 600,00 |
| **Лот № 7:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71128 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 321,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 60/5, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000118 площадью 0,1666 га, составные части и принадлежности: артскважина, сенажная траншея | 45 000,00 | 4 500,00 |
| **Лот № 8:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-73758 (наименование: коровник фермы № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 606,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 74/ 3, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001002962 площадью 0,6761 га | 35 000,00 | 3 500,00 |
| **Лот № 9:** 1) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71274 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения) площадью 471,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/4, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124 площадью 1,2527 га; 2) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70118 (наименование: здание красного уголка; назначение: здание административно-хозяйственное) площадью 25,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124 площадью 1,2527 га; 3) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70119 (наименование: здание склада; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 252,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/1, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124 площадью 1,2527 га; 4) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70116 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1322,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/3, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124 площадью 1,2527 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика для молодняка, площадка для навоза, две сенажных траншеи, артскважина; 5) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70115 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 682,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/2, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124 площадью 1,2527 га, составные части и принадлежности: выгульный дворик, рампа погрузо-разгрузочная с весами | 263 700,00 | 26 370,00 |

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, 80162918159, тел./ф 80162918159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % оплата в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 05 декабря 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 04 декабря 2023 г. до 17.00

# ВЕТРАЗІ І БУРЫ СЯРГЕЯ ГРАХОЎСКАГА

## Штрыхі біяграфіі да 110-годдзя паэта

**Ён прыходзіў у наш кабінет у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», пастукваючы кульбачкай, сядаў у стары, пацёрты, але яшчэ ўтульны, фатэль і, бліскаючы пільнымі цёмнымі вачыма, разважаў аб прачытаным нядаўна ў газеце. Ацэнкі даваў трапныя і рэзкія. Кожны раз прыносіў новыя вершы і казаў: «Гэта мае апошнія». Праз нейкі час прыходзіў з новымі «апошнімі»...**

І гэта было вельмі кранальна — для тых, хто ведаў, што аўтар на два дзесяцігоддзі быў пазбаўлены магчымасці ствараць, нават мець пры сабе аловак часам лічылася злачынствам.

Ён — адзін з нямногіх, хто выжыў у лагерах і высылках, вярнуўся, засведчыў перажытае ў тую страшную эпоху, калі знікла цэлае пакаленне маладых беларускіх літаратараў. *«Я двойчы прайшоў усе кругі пекла і не зламаўся, не знік на таёжных скрываўленых трасах. Смерць удзень і ўначы цікавала кожнага з нас і гнала ў нябыт мільёны сумленных і таленавітых. А я ўсё ж з ёю недзе размінуўся. У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з безнадзейнасці да жыцця і збавення».*

Ва ўсіх вірах захаваў вернасць роднаму слову, бо менавіта Сяргей Грахоўскі — аўтар верша «Ветразь», які часта цытуюць: верша, складзенага цалкам з непаўторных беларускіх слоў, якім няма адпаведнікаў, доказ багацця і вартасці нашай мовы.

Гэтымі днямі спаўняецца 110 гадоў з таго дня, як у вёсцы Нобель, што ў Пінскім павеце, нарадзіўся Сяргей Грахоўскі. Красамоўная назва, дарэчы: нобелеўскі ўраджэнец! Але гісторыя нараджэння была невясёлай: *«Імперыялістычная вайна забрала бацьку ў салдаты, а мяне з маці пагнала ў бежанцы. Было ўсё так, як напісана ў маёй «Паэме дарог», калі на адным і тым жа возе, дзе едуць бежанцы, уцякаючы ад вайны, побач з бабкай, якая «плыве ў смяротны холад забыцця», «курчыцца і енчыць парадзіха».* Дзяцінства і юнацтва Сяргей Грахоўскі правёў у Глуску, дзе жыў яго стрыечны брат, паэт Янка Бобрык, першы верш надрукаваў у трынаццаць гадоў. Давайце ўспомнім некаторыя моманты біяграфіі паэта, карыстаючыся яго ўспамінамі.

### Сарамяжны журналіст

Калі адбыўся першы вялікі паэтычны форум толькі што створанага Саюза пісьменнікаў, малады Сяргей Грахоўскі працаваў у рэдакцыі грамадска-палітычнага вяшчання радыёкамітэта і павінен быў штодня даваць у эфір інфармацыю пра работу пленума, арганізоўваць выступленні пісьменнікаў.

«Сем дзён Мінск жыў літаратураю. Ні да таго, ні пасля столькі славутых пісьменнікаў у ім не збіралася, — цэлы цягнік талентаў шматмоўнага Саюза», — успамінаў Грахоўскі. Малавядомы «тоненькі і доўгі Сяргей Міхалкоў» пад вясёлы смех і шчодрыя воплескі ўпершыню чытаў свайго «Дзядзьку Сцёпу», запомніўся «танклявы прыгожы блакітнавокі юнак з аўсяным чубам валасоў» — Твардоўскі. Выступаў Пастарнак, які *«загаварыў пра паэзію ў стылі яго славутага верша: «Это круто налившийся свист. Это щёлканье сдавленных льдинок».* Шчыра кажучы, я ды і многія мае знаёмыя не многа зразумелі з яго і сапраўды блытанай, асацыятыўнай прамовы. Адчувалася, думкі абганяюць яго словы, не закончыўшы адну, пачынаў другую, нешта ўспомніўшы, нечакана гаварыў зусім іншае».



А для маладога Грахоўскага былі суцэльныя пакуты з-за... уласнай сарамяжнасці: *«О-о, гэта было самае цяжкае! Як адважыцца падысці да Асеева або Пастарнака, Ісакоўскага або таго ж Безыменскага? Ні вопыту, ні смеласці, ні журналісцкага такту і хваткі ў мяне не было аніяк. А можа, гэта і ратавала мяне. Калі я, чырвоны да вушэй, збянтэжаны, заікаючыся, прасіў каго-небудзь выступіць, дык добрыя спагадлівыя людзі проста шкадавалі мяне і амаль адразу згаджаліся. Ніякага гуказапісу тады яшчэ ў нас не было, усё сказанае ішло адразу ў эфір».*

### Акапялюшаныя і Купала

Пасля працы на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце ў 1931-м Грахоўскі прыехаў «усталёўвацца ў Мінск»: *«Я ўжо быў прытручаны асалодаю друкавання і вельмі ж хацеў прыстаць да літаратурнага асяроддзя, бываць у Доме пісьменніка, хоць здалёк бачыць Купалу, Коласа, Гартнага, Чарота, пазнаёміцца з маладзейшымі паэтамі».*

Але каб лічыцца сваім у гэтым асяродку, аказалася, мала толькі пісаць вершы.

*«Я ж быў членам Бабруйскай філіі БелАППа, друкаваўся ў «Маладняку» і ў «Чырвонай Беларусі», а хадзіць у пісьменніцкі дом не адважваўся, часам спыняўся каля яго, глядзеў, як заходзілі і выходзілі пераважна маладыя людзі, амаль усе ў капелюшах. Капялюш мне здаваўся ледзь не пасведчаннем прыналежнасці да пісьменніцтва. Асабліва стараліся хутчэй «акапялюшыцца» пачаткоўцы. Можна было сустрэць хлопца ў ботах, у аблямаваным кажушку і ў новенькім натапыраным капелюшы».*

Праўда, сам Грахоўскі, ужо сталы, запомніўся сваімі берэтамі і кепкамі... Ці не таму, што Янка Купала, за якім малады захоплены паэт хадзіў хвастом, як і многія іншыя, сустрэўся яму без капелюша: «шэрая кепка, добрага крою макінтош, жоўтыя чаравікі, у руцэ загнуты кіёк».

### Купала і «лесвічка»

І вось малады паэт Сяргей Грахоўскі перабраўся ў Мінск, у цэнтральнай газеце надрукавалі яго вершы.

*«Разгарнуў і любуюся лесвічкамі і прыступкамі сваіх радкоў. Разбіўка была прыкметаю «сучаснасці». У гэтым жа нумары надрукаваны «Ударніку» і «Заўсёды наперад» Янкі Купалы. Пакуль гартаў часопіс, да кіёска падышоў Іван Дамінікавіч, павітаўся з кіяскёрам і са мною. Купіў «Праўду» і «Звязду», прагледзеў загалоўкі, паклаў скрутачак у кішэню. «Калі нацешыўся сваім творам, дык хадзем разам».*

Зразумела, пачаткоўцу больш за ўсё хацелася пачуць ухвалу ад самога Купалы. Той жа ўсё маўчыць ды маўчыць.... А потым і кажа:

*«Пакуль чытаў твой верш, ну ж і накульгаўся, не раўнуючы, па шпалах сігаў і ўсё з нагі збіваўся. Навошта так ламаць радок? Зірні, які празрыстым і зразумелым стаў Маякоўскі ў канцы. Праўда, чым прасцей, тым цяжэй. Дарма, перахварэеце і гэтым адзёрам. Вунь Валодзя Хадыка! Той не выломваецца. Кожны радок, як адліты, аж гудзе».* Я вінавата апусціў галаву. Дзядзька Янка спагадліва зірнуў і суцешыў: *«Не журыся. Я так, на будучае, каб меней трэску было. Як на цяперашні час, дык вершык ніштаваты. Чытаў».*

*...Мы развіталіся на рагу Ленінскай. Я пайшоў бязмэтна блукаць з вуліцы ў вуліцу. Не хацелася ні з кім сустракацца. Было брыдка за «драбіны», за трэск, за несапраўднае, напісанае абы надрукавалі. З купленых часопісаў пакінуў адзін, астатнія цішком сунуў у нейкую сметніцу».*




### Страшны кастрычніцкі вечар

Літаратурная кар'ера, між тым, складвалася ўдала. Сяргей Грахоўскі быў стыльрэдактарам і адказным за літаратурныя старонкі ў «Чырвонай змене», студэнтам газетна-выдавецкага аддзялення педінстытута. У 1934 годзе «Звязда» нават даручыла яму і яго сябру Юрку Лявоннаму падрыхтаваць разварот пра дасягненні новых МТС і палітаддзелаў пагранічнай Полацкай акругі.

*«Так мы дружна і весела жылі, пакуль не насунуўся страшны «хапун»... У кожным доме да раніцы прыслухоўваліся да стуку, рыпу, гулу машыны, трымалі пакуначкі з бялізнаю ў чаканні «чорнага варанка». І ён не затрымліваўся, забіраў кожную ноч».*

Дайшла чарга і да Сяргея Грахоўскага: «*...Памяць зноў і зноў вяртае ў той дажджлівы кастрычніцкі вечар 1936 года. Я працаваў у радыёкамітэце. Рана здаў усе перадачы, а дамоў ісці не хацелася: сланяўся па рэдакцыі, гартаў падшыўкі газет, чамусьці было страшна выйсці ў трывожную слату асенняга вечара. Пабадзяўся па гастраноме, пастаяў у чэргах, даехаў трамваем да Камароўкі і марудна паплёўся па цёмнай і гразкай Цнянскай вуліцы да барачнага тыпу дома, дзе і мне далі пакойчык. Здалёк убачыў сваё асветленае акно, і апанаваў невядомы страх. Стрымлівала нейкае трывожнае прадчуванне. І яно не падвяло: бяда чакала мяне і правяла 19 кастрычніка жалобную рысу ў маім жыцці».*

Дома ішоў вобыск. Вядома, не верылася ў нешта сур'ёзнае — Грахоўскі не ведаў за сабой ніякай віны. Але яго арыштавалі — і ў гэтую кватэру ён не вярнуўся ніколі. Жонка паэта была цяжарная... Грахоўскі нават праз гады з цяжкасцю мог успамінаць пра падзеі таго часу: *«На тым парозе абарвалася мая маладосць, страчанае назаўсёды каханне, там убачыла свет маё дзіця, толькі я яго ніколі не пабачыў, а неўзабаве і яно стала ахвяраю крывавага тэрору: жонку з дзіцем на руках выселілі з ведамаснай кватэры, выключылі з інстытута. Без прытулку і грошай да самых маразоў яны начавалі ў скверы на плошчы Волі, родныя і знаёмыя баяліся даць прытулак і памагчы. Калі пахавала сына, падалася на нейкі торфазавод, і нашы шляхі разышліся назаўсёды».*

### Казачнік для зэкаў

Пра колы пекла, праз якія давялося прайсці ў зняволенні, Грахоўскі распавёў у сваёй трылогіі «Такія сінія снягі», «Зона маўчання», «З воўчым білетам». Там ёсць раздзел пра час, калі паэт апынуўся сярод крымінальнікаў. *«Я адзін чужы сярод урканаў. Як яно будзе? Вырашыў: з ваўкамі жыць — па-ваўчынаму выць. Не, я не стаў ні злодзеем, ні фармазонам (аферыстам), ні карцёжнікам, але і сябе ў крыўду не даваў».*

Адным са сродкаў «здабыць аўтарытэт» для такіх, як Грахоўскі, была здольнасць сачыняць гісторыі. І паэт *«фантазіраваў бессаромна, расказваючы «романы». Я іх упрыгожваў таямнічымі палацамі і незямнымі прыгажунямі, захаванымі ў няўлоўных рабаўнікоў банкаў, галаваломнымі ўцёкамі і таемнымі сустрэчамі на шыкоўных курортах і ў казачных вілах. У маіх слухачоў аж слінкі цяклі ад задавальнення. Часам да адбою чытаў вершы. Слухаючы «Мцыры» і «Ліст да маці» Ясеніна, некаторыя бессаромна выціралі слёзы, а каб прыхаваць расчуленасць, давалі вышэйшую ацэнку: «От у рот ёдам мазаны хапае за душу і, як панчоху, выварочвае. А Ясеніна часта «менты» забіралі? Свой хлопец быў, а піса-а-аў як!» Тады я мяняў рэпертуар на «Біблію» Крапівы. Усе разумелі і дружна рагаталі. Так я заслужыў імунітэт недатыкальнасці, павагі і нават некаторай палёгкі».*

### Чаравічкі для Алі

Так сталася, што менавіта ў пекле сібірскіх лагераў паэт сустрэў вялікае каханне, якоеператрывала ўсе выпрабаванні.

Аднойчы ў лагер прыгналі жаночы этап. *«Пакуль выклікалі астатніх, я ўгледзеў каля ганка страшнай баковачкі оперупаўнаважанага маленькую, як падлетак, зусім беленькую, у сіняй сукеначцы ў крапінку, дзяўчынку. Па шчоках каціліся буйныя слёзы. Мне яе зрабілася асабліва шкода. Яна здавалася бездапаможнаю і адзінокаю, нечым вылучалася з натоўпу кідкіх прыгажунь, запомнілася мне адразу і запала ў душу».*

Грахоўскі даведаўся пра лёс дзяўчыны: правучылася два гады ў педінстытуце, а калі ўявілі плату за вучэнне, паехала настаўнічаць у вясковую школу непадалёк ад свайго гарадка. З пачаткам вайны пад абстрэлам і бамбёжкаю знаёмымі ляснымі сцежкамі прабілася дадому, пайшла ў міліцыю аформіць прапіску ў бацькоўскай і не вярнулася — следства нават не пачалі, пагналі ўсіх арыштаваных у лагер.

Паэт заўважыў, што небарака *«паўзла, як на лыжах, у вялікіх лапцях на босых маленькіх ножках. Мне здалося, што яна ўжо на мяжы пагібелі, і захацелася хоць чым-небудзь ёй дапамагчы».* Грахоўскі быў ужо «старажылам», меў шмат карысных знаёмстваў... Ён дамовіўся, каб для дзяўчынкі здабылі чаравікі. Завёў у капцёрку...

*«Там нас чакаў Яша Смірноў, вясёлы, гаваркі валжанін. Ён паставіў на прылавак даволі зграбныя, адрамантаваныя Макравусавым чаравічкі. «Памерайце». Аля пылапа вачыма і не рухалася. Не ведаю, пераканаўча я хлусіў ці не, гаворачы, што яе прэміравалі за старанную работу на пагрузцы і... па разутасці. Удвух мы ўгаварылі яе ўзяць абнову і распісацца ў ведамасці, а яна ўсё даводзіла, што многія дзяўчаты працуюць куды лепш.*

*Назаўтра яна ўжо хадзіла хоць і не надта ў прыгожых, але ўсё ж чаравіках».*

Так пачалася гісторыя кахання... *«Вольнаю часінаю мы рознымі сцежкамі сыходзіліся на некалі высечанай дзялянцы. Бярозавыя пні паабрасталі парасткамі, хваёвыя — пакрыліся бурштынаваю смалою, у высокай траве, як жар, чырванелі суніцы. Іх тут не было каму збіраць. Мы лажыліся на траву, перапаўзалі ад куста да куста і губамі лавілі даспелыя салодкія ягады. Над намі было сіняе-сіняе, без адзінай хмурынкі неба, паволі гайдаліся задуменныя сосны, зялёная яшчарка грэлася на пяньку, цішыня, смольны водар і дух разнатраўя вярталі на некалькі гадзін на далёкую і амаль забытую волю, якое шчасце пабыць сам-насам пасля камернага і барачнага шматлюддзя».*

У лагеры і нарадзілася іх старэйшая дачка, Таццяна. *«Я трымаў чырвоненькі кірпаты, вільготны і цёплы камочак — роднае дзіця, народжанае ў няволі».*

Наперадзе былі новыя выпрабаванні, яшчэ адзін арышт, потым — рэабілітацыя, вяртанне ў Мінск... Шмат працы, новых кніг, прызнанне, Дзяржаўная прэмія БССР. І занатаваная памяць.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого повторного аукциона

**Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 125/С-12711 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома) площадью 34,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Ратайчицкий с/с, д. Борщёво, ул. Веры Хоружей, 5, на земельном участке с кадастровым номером 124085500601000065 площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: две холодных пристройки, три сарая, колодец

| Начальная цена, руб. | 16 059,16 | Размер задатка, руб.: | 1 605,92 |
|---|---|---|---|

